Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 145 (5519)
СУБОТА
27
ЧЭРВЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны доўг кожнага грамадзяніна СССР. Здрада радзіме: парушэнне прысягі, пераход на бок ворага, нанясенне шкоды ваеннай магутнасці дзяржавы, шпіянаж у карысць замежнай дзяржавы—караюцца па ўсёй строгасці закона, як самае цяжкое злачынства.

(З праекту Канстытуцыі Саюза ССР)

ДАКУМЕНТ ГІСТАРЫЧНАЙ ВАЖНАСЦІ

У нашай краіне кожнаму грамадзяніну забяспечана права на асвету. Праект новай Канстытуцыі з усёй чоткасцю, упершыню ў гісторыі гэта права замацоўвае законам, соцыялістычны лад і яго Канстытуцыя забяспечваюць ажыццяўленне гэтага права.

«Совецкі Саюз — гэта краіна, якая вучыцца», — гаворыць замежныя спецыялісты, якія прыязджаюць да нас і здзіўлены шырынёй размаху пастаноўкі справы народнай асветы.

Сапраўды, ні ў адной капіталістычнай краіне школа, пачатковая, сярэдняя і вышэйшая, не акружана такой увагай, як у нас. Ні ў адной краіне школьнік і студэнт, настаўнік і прафесар не акружаны такой увагай, не адчуваюць такога падтрымання і такіх клопатаў, не карыстаюцца такой павагай, як у нас, у краіне соцыялізма.

І гэта зусім натуральна. Соцыялізм немыслім без ведаў, без культуры. Соцыялістычнаму грамадству патрэбны культурныя, усебакова развітыя людзі, людзі, якія ўладаюць, як гаварыў Ленін, веданнем усіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва.

Такія людзі нам патрэбны, бо людзі, кадры вырашаюць усё, бо кадры—гэта той капітал, які ў соцыялістычным грамадстве каштоўней за ўсе капіталы.

Адсюль такая ўвага ўсёй партыі, асабіста таварыша **Сталіна** да школы, да школы пачатковай, сярэдняй, вышэйшай.

У вядомых рашэннях партыі і ўрада, якія былі прыняты па непасрэднай ініцыятыве таварыша **Сталіна**, вызначалася ўся сума пытанняў, звязаных з паляпшэннем работы школы, з перабудовай педагагічнага працэсу і методыкай выкладання, з унутраным распарадкам і дысцыплінай у школе.

І трэба сказаць, што рэалізацыя гэтых рашэнняў партыі і ўрада ўжо сказалася і асабліва на навучальным годзе, які закончыўся.

Але калі ў пачатковай і сярэдняй школе мы маем ужо, як рэзультат правільнай перабудовы работы, значнае паляпшэнне ўсёй школьнай справы, то становішча вышэйшай школы, становішча падрыхтоўкі ў ёй кадраў застаецца нездавальняючым.

Аб гэтым з усёй выразнасцю гаворыць апублікаваная ў нашай газеце ад 24 чэрвеня пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і ЦК ВКП(б) «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і кіраўніцтве вышэйшай школай».

СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) адзначылі незабяспечанасць ВНУ высокакваліфікаванымі навукова-педагагічнымі кадрамі, шматпраграмнасць, раздробленасць і мноства профіляў, паралелізм у падрыхтоўцы кадраў, наяўнасць асуджаных партыяй «брыгадна-лабараторных» метадаў навучання, разрыў паміж вытворчай практыкай і акадэмічнымі заняткамі, неарганізаванасць усяго педагагічнага працэсу.

Гэтыя недахопы сказаліся на тых недавучаных кадрах, якія ў разе выпадкаў выпускалі нашы вышэйшыя школы.

З другога боку, адсутнасць дакладнага профілю побач са шматлікасцю профіляў прыводзіла да таго, што ў разе выпадкаў студэнты па сканчэнню універсітэта паступалі працаваць не па спецыяльнасці.

Пастанова СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) з усёй сур'ёзнасцю ставіць пытанне аб кіраўніцтве вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Трэба прама сказаць, што **многія наркаматы і ў нас, у БССР, падыходзяць да сваіх вышэйшых навучальных устаноў выключна па-спажывецку.** Не ўваходзячы ў становішча ВНУ, не кіруючы імі, яны чакалі чарговага выпуску, каб размеркаваць па развёрстцы выпушчаныя кадры. Пастанова зусім правільна адзначае, што **«ВНУ далёка не карыстаюцца той увагай, якою звычайна карыстаюцца ў наркаматах прадпрыемствы».**

Такім чынам пастанова, ускрываючы істотныя недахопы ў рабоце вышэйшых навучальных устаноў і кіраўніцтве імі, паказвае, на што павінен быць зараз зроблен упор, каб дабіцца паляпшэння становішча школ. Пастанова адначасова разгортвае практычную праграму перабудовы вышэйшай школы, перабудовы яе работы ў адпаведнасці з узрослымі задачамі.

Пастанова СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) надзвычай канкрэтная. З выключнай падрабязнасцю ўстанаўляецца парадак прыёму, парадак арганізацыі вучэбнага часу, вучэбнай работы, парадак кіраўніцтва вышэйшай школай, унутраны распарадак і дысцыпліна ў школе. Яна ўстанаўляе адзіныя правілы прыёму, прычым гэтыя правілы агараджаюць ВНУ ад недавучаных, непадрыхтаваных для вышэйшай школы людзей. Гэты парадак прымусіць нашу моладзь перад паступленнем у ВНУ вучыцца больш старанна, гэта-ж забяспечыць ВНУ поўнапэнным папаўненнем.

Пастанова знішчае рознабой у арганізацыі вучэбнага часу і вучэбнай работы, уводзіць дакладныя, прадуманыя, забяспечваючыя паспяховую вучобу студэнтаў парадкі.

Адначасова з гэтым пастанова наводзіць парадак у кіраўніцтве ВНУ. Замацоўваецца большэвіцкі прынцып адзіначалля дырэктара ВНУ, устанаўляецца парадак, пры якім кіруючымі работнікамі ВНУ могуць быць людзі сапраўды падрыхтаваныя, адукаваныя, ведаючыя гэту справу. У практыцы мы ведаем нямала фактаў, калі кіраўнікамі вышэйшых навучальных устаноў аказваліся выпадковыя, нізкакультурныя людзі, людзі, якія не маюць ніякай кваліфікацыі.

Клопатамі аб студэнце — будучым спецыялісце, аб студэнце, як прадстаўніку растучай совецкай інтэлігенцыі, прасякнута ўся пастанова. Прад'яўляючы высокія патрабаванні да студэнта і кіраўніцтва, патрабуючы найстражэйшай дысцыпліны і парадку, партыя і ўрад клапоцяцца аб жыллёвых і бытавых умовах студэнтаў, аб дапаможніках для іх, аб кваліфікаваных выкладчыках, аб іх будучым.

У гэтай пастанове з усёй чоткасцю відны сталінскія клопаты аб кадрах, якім належыць будучыня.

Толькі гэтым можна тлумачыць той выключны ўздым, які выклікала пастанова і сярод студэнтаў і сярод выкладчыкаў.

У гэтых радасных водгуках адчуваецца сынава ўдзячнасць партыі, ураду, любімаму правадыру таварышу **Сталіну** ад соцень тысяч юнакоў і дзяўчат за бацькаўскія клопаты, дапамогу і ўвагу.

ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЯ ПРАГРАМА КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

Прамова комуністычнага дэпутата Габрыэля Перы ва французскай палаце дэпутатаў

ПАРЫЖ, 24 чэрвеня. (БЕЛТА). Пасля агалашэння ў палаце дэпутатаў урадавай дэкларацыі, прысвечанай пытанням знешняй палітыкі, рад дэпутатаў выступіў з запытаннямі. Большасць выступаўшых дэпутатаў належыць да правых і да фашысцкіх груповак палаты.

Мантын'і (фракцыя «дэмакратычнай левай» і «радыкальнай незалежнай» прапаведваў прамыя перагаворы з Германіяй. **Дэ-Керыліс** (далучыўся ў палаце да так званых «рэспубліканскіх незалежнікаў») заявіў, што ён не давярае людзям, якія ўваходзяць ва ўрад, і ў першую чаргу не верыць Далад'е, які нібыта «трымае асабістага друга ў якасці надзвычайнага пасла пры Гітлеру». Дэ-Керыліс шмат гаварыў аб небяспецы германскага нападу на Францыю і Чэхаславакію, але ў той-жа час нападаў на франка-совецкі дагавор аб узаемнай дапамозе. У заключэнне ён абрушыўся на партыі народнага фронта, у асаблівасці на комуністаў.

Гэтыя выступленні прарывалися пратэстамі дэпутатаў левых партый

З вялікай увагай была выслухана палатай прамова комуністычнага дэпутата **Габрыэля Перы.**

— Адмена антытальянскіх санкцый — заявіў Перы — ні ў якой меры не змякчыць асуджэнне італьянскай агрэсіі. Аднак, у сучасны момант пытанне заключаецца перш за ўсё ў тым, як прадухіліць пагрозу, навісшую над мірам Усякая капіталістычная сістэма нясе ў сабе вайну. Трэба, аднак, падкрэсліць, што ў сучасны момант найбольшую небяспеку прадстаўляе захватніцкая палітыка германскага фашызма. Усё сведчыць аб тым, што Гітлер хоча вайны.

Комуністычная фракцыя звяртаецца да германскага народу з заклікам прыняць удзел разам з іншымі народамі ў справе міру. Комуністычная фракцыя, першая асудзіўшая версальскі дагавор, заклікае германскі народ да супрапоўніцтва.

Небяспека вайны ствараецца надзеяй, а часам і ўпэўненасцю агрэсара ў тым, што ён астанецца беспакараным. Трэба разбурыць гэту надзею і знішчыць гэту ўпэўненасць. Гэта і будзе палітыкай міру Трэба **аднавіць англа-французкае супрацоўніцтва,** падарванае палітыкай Лаваля, падтрымаўшага Мусаліні. Трэба звярнуцца да англійскіх працоўных, да англійскай грамадскай думкі, якая імкнецца да калектыўнай безапаснасці, а не да лорда, які прымае Рыбентропа і яго эмісараў. Неабходна паказаць Англіі, што **япона-германскае збліжэнне пагражае яе безапаснасці і яе гандлю.** Пасля аднаўлення франка-брытанскай згоды трэба агарадзіць ад магчымых удараў народы дунайскіх краін.

Франка-польская дружба таксама з'яўляецца адным з залогаў міру,— прадаўжаў Перы. — Неабходна сказаць польскаму народу, што Францыя супроць усякай думкі аб дыэкторыі вялікіх дзяржаў, якія навязваюць свае законы Малой Антанце. Польскі народ пачуе гэтыя словы нават у тым выпадку, калі іх адмовіцца слухаць палкоўнік Бек.

Компартыя хоча міру з усімі народамі. Яна хоча арганізаваць поўны і ўсебаковы мір. Няма нічога небяспечней насілля, якое ўвянчалася поспехам. **Міжнародны саюз працоўных павінен забяспечыць выратаванне міру** (апладысменты на крайняй левай). Гэта выратаванне патрабуе, каб урад дзейнічаў у адным і тым-жа напрамку як унутры краіны, так і за яе межамі.

Звяртаючыся да міністра замежных спраў Дэльбоса, Перы гаворыць у заключэнне: «Супроць прыхільнікаў палітыкі і вайны вы будзеце абараняць выданы вам Францыяй мандат. Мы апладзіравалі вам, калі гаварылі аб волі ўрада да барацьбы за мір і свабоду. Вы выратуеце мір арганізацыяй калектыўнай безапаснасці супроць фашызма і яго ваяўнічых намераў. Вы выратуеце свабоду арганізацыяй народнай абароны супроць людзей Кобленца» (французскія контрэволюцыйныя эмігранты часоў французскай рэволюцыі).

Левая большасць палаты падымаецца са сваіх месц і наладжвае Перы авацыю.

У сваім адказным выступленні міністр замежных спраў Дэльбос заявіў, што Францыя будзе выконваць усе ўзятыя на сябе абавязацельствы. Урад вельмі добра сабе ўяўляе існуючую небяспеку. Французскі ўрад хоча астацца верным калектыўнай безапаснасці, бо лічыць, што старая сістэма саюзаў ракавым чынам павяла-б да вайны.

Францыя зробіць усё магчымае для таго, каб абараніць міжнародную справядлівасць і не згадзіцца ні з якімі двухсэнснымі формуламі ў адказ на парушэнне Лакарно.

Пасля выступлення Дэльбоса комуністычная, соцыялістычная і радыкал-соцыялістская фракцыі, групы «соцыялістычнага саюза» і «незалежная левая» ўнеслі наступны праект рэзалюцыі:

«Палата адабрае дэкларацыю Ўрада, даручае яму справу абароны міру і Францыі на аснове калектыўнай безапаснасці, адхіляе ўсякія дадаткі і пераходзіць да парадку дня».

Урад ставіць пытанне аб давер'і. **Палата выражае давер'е Ўраду большасцю галасоў у 362 супроць 198.**

Удовіна Таіса Александраўна — жонка каменданта № -скага пагранатрада, удзельніца акруговай нарады жонак камандзіраў-пагранічнікаў, узнагароджаная граматай ЦВК і СНК БССР. Фото Зайкова.

Якуб КОЛАС

ПЕСНЯМ ВІТАЮ Я ВАС

Леглі шырока нівы калгасаў,
Глянем — разлог, далячынь!
Стужак дарожных роўныя пасы
Мераюць смужную сінь.
Ходзіць паважна дбалы араты,
Трактар — палёў гаспадар.
Дужы і ў працы спорны, заўзяты.
Ходзіць-гамоніць абшар!
Скінуты межы, свет разгарожан—
Воля, бязмежны прастор!
Яснае заўтра, дзень наш прыгожы,
Досвіткаў тысячы зор!
Змоўкла ў прасторах песня старая —
Скаргі адвечны палон.

Творчая праца нас адарае
Песняй расквечаных дзён.
Песні гаворыць — жыць стала лепей.
Песні, як мак, расцвялі.
Поўняцца імі горы і стэпы
Нашай Совецкай зямлі.
Плаваюць песні звонкім разлівам,
Песні расквечаных дзён.
Песням вясёлым, песням шчаслівым
Хочацца ўторыць мне ў тон.
Марш перамогі ў радасным гудзе...
Хіба-ж не радасць — наш час?
Краю Совецкі, вольныя людзі!
Песняй вітаю я вас.

26/VI 1936 г.

КАНФЕРЭНЦЫЯ У МАНТРЭ

МАНТРЭ. 24 чэрвеня. (БЕЛТА). Па прапанове прадстаўніка Турцыі Тэфік Рушпю Араса канферэнцыя па пытанню аб праліўах прыступіла да абмеркавання тых умоў забеспячэння безапаснасці праліваў, якія будуць уключаны ў любое рашэнне пытання аб рэжыме праліваў (напрыклад, заўчаснае папярэджанне турэцкага ўрада, падача сігналаў, абмежаванне колькасці танажу суднаў, якія праходзяць праз праліўы).

Патрабаванне Турцыі, каб у мірны час турэцкі ўрад быў заўчасна папярэджан аб надыходзячым праходжанні суднаў праз праліўы, не сустрэла ў прынцыпе пярэчанняў, аднак былі зроблены агаворкі адносна тэрміну папярэджання, які патрабуе яшчэ вывучэння.

Што-ж датычыць пытання аб абмежаванні танажу суднаў нячорнаморскіх дзяржаў, якія праходзяць праз праліўы, англійскі делегат лорд Стэнхоп выказаў сваю прынцыповую згоду з гэтай прапановай, але агаварыў, што права прапановаць больш высокі ліміт, чым 14 тысяч тон, прадугледжаныя турэцкім праектам новай канвенцыі. Тав. Літвінаў таксама згадзіўся з прынцыпам абмежавання танажу з прычыны наяўнасці ў арт. 6 пункта, які агаварвае асобае становішча чорнаморскіх дзяржаў.

Французскі дэлегат Поль Бонкур адзначыў, што абмежаванне танажу, дапускаемага ў Чорнае мора, не павінна адносіцца да перасоўкі суднаў, якая адбываецца ў выкананне абавязацельстваў, што вынікаюць са статута Лігі нацый.

Затым тав. Літвінаў унёс наступны праект новай рэдакцыі 7-га артыкула:

«У ваенны час, калі ні адна з чорнаморскіх дзяржаў не з'яўляецца ваюючым бокам, ваенныя і падсобныя судны карыстаюцца вольным праходам праз праліўы на ўмовах, прадугледжаных папярэднімі артыкуламі. Аднак, праход у Чорнае мора будзе забаронен усякаму судну ваюючых дзяржаў. Калі якая-небудзь чорнаморская дзяржава, паміма Турцыі, акажацца ваюючым бокам, то праход у Чорнае мора забараняецца для ўсіх ваенных суднаў нячорнаморскіх дзяржаў.

Указанні данага артыкула не могуць, аднак, служыць перашкодай для паходу ваенных суднаў у выкананне абавязацельстваў аб дапамозе, якія выцякаюць са статута Лігі нацый або з пагаднення, заключаных у рамках статута»

***

МАНТРЭ, 25 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння на закрытым пасяджэнні пленум канферэнцыі закончыў першае чытанне праекту канвенцыі. Літвінаў к канцу дня паехаў у Жэневу.

Совецкія эксперты астаюцца ў Мантрэ для ўдзелу ў работах тэхнічнай і рэдакцыйнай камісій.

IX З'ЕЗД КОМПАРТЫІ ЗША

НЬЮ-ЮРК, 24 чэрвеня. (БЕЛТА). На IX з'ездзе компартыі ЗША са справаздачным дакладам выступіў генеральны сакратар ЦК т. **Броўдэр.**

Дакладчык крытыкаваў прэзідэнта Рузвельта за яго ўступкі патрабаванням рэакцыянераў. Ён указаў, што «асноўнае пытанне цяперашняй выбарчай кампаніі — гэта дэмакратыя ці фашызм», і падкрэсліў, што самай надзённай задачай дня з'яўляецца арганізацыя шырокага народнага фронта для барацьбы з рэакцыяй і фашызмам.

Аналізуючы міжнароднае становішча, Броўдэр заявіў, што ў сучасны момант свет падзелен на два лагеры, лагер міру і прагрэсу, пытадэллю якога з'яўляецца Совецкі Саюз, і лагер рэакцыі, найбольш буйным прадстаўніком якога з'яўляецца фашысцкая Германія.

Праект новай Канстытуцыі СССР — дэманстрацыя велічча дасягненняў соцыялізма ў Совецкім Саюзе.

«Совецкі Саюз — сказаў Броўдэр — стварыў самую дасканалую дэмакратыю, якую калі-небудзь бачыў свет, на цвёрдай аснове ўлады рабочага класа і соцыялізма. СССР за 19 год, з часу соцыялістычнай рэволюцыі, дасягнуў таго, што не снілася і вялікім утапістам».

Броўдэр падкрэсліў значныя дасягненні ў стварэнні адзінага фронта, асаблівыя поспехі ў рабоце сярод беспрацоўных і моладзі. Лік членаў партыі ў гэтым годзе — заявіў Броўдэр—дасягнуў 40 тысяч супроць 25 тысяч у 1934 годзе. Саюз комуністычнай моладзі налічвае 11 тыс. членаў супроць 5 тыс. у 1934 годзе.

ТАВ. ВАЛКОВІЧ НА БУДАЎНІЦТВЕ ПАЛАЦА ПІОНЕРАЎ І ОКЦЯБРАТ

Учора сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч** наведаў будаўніцтва Палаца піонераў і окцябрат у Менску. Тав. Валковіч цікавіўся ходам будаўніцтва і паасобнымі яго дэталямі. Ён даў будаўнікам рад указанняў адносна афармлення Палаца.

Палацу піонераў і окцябрат перадзен вялікі сад, які будзе злучан пераходным мастом з ракой Свісла. У садзе арганізуюцца амерыканскія горкі і рад іншых забаў. Запраектавана другая чарга будаўніцтва. Намячаецца пабудова вялікага дома для дзіцячай бібліятэкі і чытальні.

АБ НАМЕСНІКАХ СТАРШЫНІ ЎСЕСАЮЗНАГА КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Зацвердзіць намеснікамі старшыні Ўсесаюзнага камітэта па справах вышэйшай школы тт. Двалайцкага Шолама Майсеевіча (першым намеснікам), акадэміка Церпігорэва Александра Мітрафанавіча і тав. Валынскага Сергея Барысавіча.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Кіраўнік спраў Совета Народных Камісараў Саюза ССР
І. МІРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль.
25 чэрвеня 1936 г.

АБ ПРЫСВАЕННІ ІМЯ ТАВ. А. М. ГОРКАГА ЎСЕСАЮЗНАМУ ІНСТЫТУТУ ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР пастанаўляе:

Задаволіць просьбу вучонага совета, дырэкцыі, партыйных і грамадскіх арганізацый Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай медыцыны і прысвоіць Усесаюзнаму інстытуту эксперыментальнай медыцыны пры СНК Саюза ССР імя тав. А. М. **Горкага.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

В. а. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
І. УНШЛІХТ.

Масква, Крэмль.
26 чэрвеня 1936 г.

Становішча ў паўднёвым Кітаі

ШАНХАЙ, 26 чэрвеня (БЕЛТА). Агенцтва «Домей Цусін» паведамляе, што генерал Чэн Пэй-тан (камандуючы войскамі правінцыі Гуандун) павялічвае гуандунскую армію на два карпусы. Улады правінцыі Гуансі фармуюць новыя тры асобныя дывізіі, камандванне якімі даручаецца былым камандзірам дывізій 19-й арміі (армія, аказаўшая супраціўленне японскім войскам у Шанхаі ў студзені — сакавіку 1932 года).

ТОКІО, 26 чэрвеня (БЕЛТА). «Домей цусін» паведамляе, што нарада ваенных лідэраў паўднёва-заходняй групоўкі пастанавіла ўмацаваць граніцы правінцый Гуандун і Гуансі супроць магчымага наступлення нанкінскіх урадавых войск.

Арыштаваныя ў пачатку канфлікта за адмаўленне ўдзельнічаць у антынанкінскай экспедыцыі генералы Ю-Хам-моу (камандуючы першай гуандунскай арміяй) і Мяо-Бей-нань (начальнік штаба гуандунскай арміі) заявілі аб гатоўнасці рашуча выступіць супроць Нанкіна.

ПАВЕТРАНАЕ ПАГАДНЕННЕ ПАМІЖ ГЕРМАНІЯЙ І ІТАЛІЯЙ

БЕРЛІН, 26 чэрвеня (БЕЛТА). Таварыш міністра авіяцыі і начальнік ваенна-паветраных сіл Італіі генерал Валле, які знаходзіцца ў Берліне, падпісаў пагадненне на 10 год з германскім міністэрствам авіяцыі аб стварэнні і эксплаатацыі ліній паветраных зносін.

Пагадненне прадугледжвае ўзаемную эксплаатацыю паветраных шляхоў, якія звязваюць Італію з Германіяй і растырэнне паветраных ліній паміж гэтымі краінамі.

Дакладны тэкст пагаднення не апублікаван.

СУСВЕТНЫ РЭКОРД ФРАНЦУЗСКАЙ ЛЁТЧЫЦЫ

ПАРЫЖ, 24 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора на аэрадроме Віллакобле французская лётчыца Марыя Хільз устанавіла жаночы сусветны рэкорд вышыннага палёту і пабіла таксама французскі нацыянальны рэкорд, устаноўлены лётчыкам Густавам Лемуан.

Марыя Хільз дасягнула, паводле некаторых вестак, 14.300 метраў вышыні; паводле другіх — 14.000. Лётчыца зрабіла палёт на спецыяльным самалёце, які прыводзіцца ў рух маторам тыпу «Гном» магутнасцю ў 900 конскіх сіл. Пад'ём цягнуўся 40 мінут, спуск—30.

АДМОВА АД САНКЦЫЙ СУПРОЦЬ ІТАЛІІ

ВЕНА, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Швейцарскае агенцтва паведамляе, што ў Жэневе пад старшынствам ланцкага міністра замежных спраў Мунка адбылася закрытая нарада прадстаўнікоў нейтральных дзяржаў (Данія, Швецыя, Нарвегія, Швейцарыя, Фінляндыя, Галандыя, Іспанія). Прынята рашэнне аб адмене санкцый супроць Італіі.

Па пытанню аб анексіі Абісініі Італіяй не прынята ніякага рашэння.

ДАКЛАДЫ ЎКРАІНСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ ДЛЯ ДАНЦЫГСКІХ ФАШЫСТАЎ

ВАРШАВА, 24 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва «Прэс» паведамляе, што група ўкраінскіх нацыяналістаў, прыхільнікаў Канавальца (лідэр фашысцкай тэрарыстычнай арганізацыі ОУН) арганізавала гэтымі днямі для студэнтаў і прафесароў—членаў мясцовых фашысцкіх арганізацый Данцыга—два даклады на «украінскія тэмы». Даклады былі зроблены ў доме нямецкіх студэнтаў.

ВОДГУКІ НА ПАСТАНОВУ СНК СССР І ЦК ВКП(б) АБ РАБОЦЕ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ І АБ КІРАЎНІЦТВЕ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛАЙ

Трэба і нам вучыцца

Я з вялікай радасцю сустрэў і прачытаў ад пункта да пункта гэты велізарнейшы дакумент аб вышэйшай школе. Вітаю неабходнасць здачы паступаючым у вышэйшую школу адной з замежных моў.

Асабліва трэба падкрэсліць пытанне аб адзнаках. Уся пастанова зыходзіць з неабходнасці прад'яўлення больш высокіх патрабаванняў да вышэйшых навучальных устаноў, да тых кадраў, якія яны выпускаюць.

Устанаўліваюцца тры ступені апэнак: нездавальняюча, здавальняюча і выдатна. Партыя і ўрад тым самым указваюць, што тое, што да гэтага часу лічылася здавальняючым, у далейшым не зможа нас задаволіць. Новыя ступені апэнак робяць асабліва адказнай ролю навукова-выкладчыцкіх работнікаў і прымусяць іх з яшчэ большай сур'ёзнасцю аднесціся да сваіх абавязкаў.

Прафесар, які дае агульны кірунак рабоце кафедры і знаёміць сваіх слухачоў з асновамі сваёй дысцыпліны, раздзяляе працу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных работнікаў са сваімі асістэнтамі. Аднак, аб якой падрыхтоўцы можа ісці гутарка, калі выкладчыкі, з якімі студэнты сустракаюцца кожны дзень, самі не кваліфікуюцца, не растуць, не займаюцца навуковай работай?

Пастанова партыі і ўрада, дакладны канкрэтныя і зусім ясныя палажэнні аб рабоце вышэйшай школы, узнімае пытанне аб падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў на больш высокую ступень.

Праф. Д. ГОЛУБ.

Вучыцца сур'ёзней

Займаючыся чатыры гады ў Менскім педагагічным інстытуце, я адчуў як адбіваюцца на вучобе ўсялякага роду непаралкі: групавая распрацоўка, адсутнасць цвёрдага распкладу, нездавальняючы падбор выкладчыкаў і т. д.

Нашым студэнтам, напрыклад, прыходзілася вывучаць яўрэйскую літаратуру, не маючы ніводнага падручніка. Часта па цэлых месяцах мы не мелі і мінімальнай нагрузкі, з-за адсутнасці выкладчыкаў. Бывалі выпадкі, калі ў нас чыталі лекцыі па літаратуры зусім выпадковыя, слаба падрыхтаваныя людзі.

Пастанова прадугледжвае ўсе неабходныя ўмовы для нармальнай і прадукцыйнай работы студэнтаў. У кожным радку адчуваюцца вялікія клопаты нашай партыі і ўрада аб нас, аб студэнтах. Мы ведаем, што патрабаванні да нас будуць узрастаць — і ў адказ на пастанову мы будзем вучыцца сур'ёзней і глыбей!

ГОЗДАНКЕР Я.,
студэнт 4 курса літфака ВПІ.

Павысіць якасць вучобы

Калі я прачытаў і прадумаў кожны пункт пастановы — для мяне як ніколі стала ясна, што ў нашай совецкай вышэйшай школе ёсць усе неабходныя ўмовы для высокаякаснага засвоення вучэбнага матэрыялу.

Зусім правільна і своечасова СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) указалі на перагрузку студэнтаў абавязковымі вучэбнымі гадзінамі і ўстанавілі колькасць вучэбных гадзін.

Гэта значна павысіць якасць вучобы. Студэнт у вольныя гадзіны самастойнай працы зможа глыбока прапрацаваць увесь той матэрыял, які рэкамендуецца прафесарам.

Пастанова СНК і ЦК І яшчэ І яшчэ раз яскрава сведчыць аб тым, што наш урад, наша партыя і любімы **Сталін** штодзенна клапоцяцца аб нашай совецкай школе.

МЕЛЬНІЧОНАК А. І.,
студэнт другога курса гістфака БДУ.

ВЫДАННЕ ПРАЕКТУ КАНСТЫТУЦЫІ СССР НА ЗАМЕЖНЫХ МОВАХ

МАСКВА, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Попыт на выпускаемыя ў Маскве выдавецтвам замежных рабочых пераклады праекту Канстытуцыі СССР узрастае з кожным днём. Выдавецтва атрымлівае значныя заказы з усіх канцоў краіны.

Першы тыраж выдання, выпускаемага для нямецкага насельніцтва Саюза, перавысіў ужо 120 тысяч экз. Тыраж для спажыўцоў англійскага выдання ў СССР складае 50 тысяч экз. Польскае выданне выпускаецца ўжо трэцім, балгарскае—другім тыражом.

УСЕНАРОДНАЕ АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТУ КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР

Незвычайны сход

★★★

— Гэта быў не звычайны сход, не нарада. Старыя слесары віцебскага завода «Чырвоны металіст», якія прапрацавалі дзесяткі гадоў на адным прадпрыемстве, сабраліся на кватэру да свайго таварыша пагаварыць аб сталінскай Канстытуцыі.—Кожны з іх не раз прачытаў гэты гістарычны дакумент. — Але-ж тут на кватэры гутарка прыняла асаблівы характар. Так даўно ўжо не гаварылі па душах. —Ніжэй мы прыводзім кароткія выступленні кожнага з удзельнікаў гэтага незвычайнага схода.

★

БЕРАГЧЫ ГРАМАДСКУЮ ЎЛАСНАСЦЬ

А. М. ГУРЗВІЧ,
тэхнік.

Наша ленінска-сталінская нацыянальная палітыка дала магчымасць кожнай нацыянальнасці шырока развіваць сваю культуру на сваёй роднай мове. Асаблівую ўвагу наша партыя і ўрад зварачаюць на падцягванне нацыянальных акраін. Павелічэнне колькасці саюзных аўтаномных рэспублік па новай Канстытуцыі з'яўляецца яркім пацвярджэннем далейшага няўхільнага ўзмацнення гаспадарчага і культурнага росту нацыянальных рэспублік. У гэтым наша сіла і нашы перамогі. Гэта чотка выражана ў сталінскай Канстытуцыі.

Права на працу. Нам здаецца дзіўным, як-жа могуць быць у нас беспрацоўныя. А вось за некалькі дзесяткаў кілометраў ад Менска, гэта ясна адчуваюць на сабе рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі.

У 131 артыкуле новай Канстытуцыі гаворыцца, што кожны грамадзянін павінен берагчы і ўзмацняць грамадскую сацыялістычную ўласнасць. Аб гэтым важнейшым пункце мы часта ў сваёй практычнай рабоце забываем. Звычайна мы лічым пасяганнем на сацыялістычную ўласнасць вялікую растрату, або кражу. Я вось прыведу маленькі прыклад, што ў нас-жа на вачах адбываецца і мы гэтага не заўважваем.

Возьмем зберажэнне варштатаў. Проста сорамна паглядзець, як выдатныя варштаты «Удмурт» і рэвальверныя з завода імя Орджанікідзе, якія каштуюць па 8—12 тысяч рублёў, стаяць брудныя. З-за нелахайных адносін да работы некаторых рабочых прыходзіцца інструментальшчыку Газарху штодзенна рамантаваць дзесяткі патронаў і планшайб.

Нам патрэбна паніць і берагчы сацыялістычную ўласнасць на кожным кроку.

ШЧАСЛІВАЕ ЮНАЦТВА, ШЧАСЛІВАЯ БУДУЧЫНЯ

Маня ДОБРАМЫСЛІНА,
студэнтка рабфака,
дачка слесара.

Усе гэтыя расказы майго бацькі і старых рабочых аб былым жыцці для мяне з'яўляюцца як-бы казкамі. Мая біяграфія вельмі кароткая. Нарадзілася ў 1917 годзе. Якое шчасце быць равесніцай Кастрычніка! Зараз капчаю рабфак пры педагагічным інстытуце. Пайду вучыцца на настаўніцу. Брат мой у сёмым класе. Хоча вучыцца на кінатэхніка.

Я пастараюся скончыць пед-інстытут і стаць добрай настаўніцай.

Шчаслівае юнацтва і яшчэ больш шчаслівую будучыню заваявала для нас совецкая ўлада. Праект сталінскай Канстытуцыі гэта нам гарантуе

ПАВЯЛІЧЫМ БАГАЦЦІ КРАІНЫ

З. В. КАПУСЦІНСКІ,
стругальшчык.

Мне ўжо 63 гады. Многае перажыў, а гляджу, якая вялікая розніца паміж сённяшнім днём і былым часам.

Я вельмі шчаслівы, што зараз, на старасці гадоў, я магу пацешыцца поспехамі сваіх дзяцей. Старэйшы сын канчае інстытут. Мы ў далейшым павінны яшчэ вышэй узняць сваю прадукцыйнасць працы, каб павялічыць яшчэ больш багацці нашай краіны.

МЯНЕ ПЕРАВЫХАВАЛІ

М. В. ПІСАРЭЎ,
слесар-стаханавец.

Быў я беспрытульным і думаў, што не выйду ў людзі. Але-ж, як відаць, я памыліўся. Тут, на заводзе, мяне перавыхавалі. Яшчэ больш дала мне Чырвоная армія, дзе я служыў. Я стаў кваліфікаваным рабочым. Нашу ганаровае званне стаханаўца.

Выключныя клопаты нашай партыі і роднага **Сталіна** аб чалавеку вывелі ў свет нямала людзей з былога «дна».

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА СУСВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

Ш. А. ДОБРАМЫСЛІН,
слесар-водаправодчык.

Сэрца радуецца, калі чытаеш артыкулы новай Канстытуцыі. 36 год я працую на вытворчасці, з іх палова пры былых гаспадарах. Раней я свету не бачыў. А зараз на сваім родным сацыялістычным прадпрыемстве мяне паважаюць, як старога рабочага. Я ўжо нямала выхаваў людзей, якія зараз з'яўляюцца высокакваліфікаванымі рабочымі, стаханаўцамі. Я ганаруся імі, бо нямала-ж і маёй працы пакладзена на іх выхаванне.

Мая сям'я пры новых выбарах дасць 4 галасы. Наша Канстытуцыя з'яўляецца вялікай перамогай усяго сусветнага пролетарыята.

ВЕЛІЗАРНАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

І. Э. ГАЗАРХ,
слесар-інструментальшчык.

Наша сталінская Канстытуцыя з'яўляецца велізарнай падзеяй у сусветнай гісторыі чалавецтва. Яна дае працоўным светлае, радаснае жыццё. Для нас, старых, гэта асаблівая радасць, што дажылі да такога часу. Рабочыя ўсіх краін глядзяць на нас, як на шчасліўцаў.

УЗМАЦНЯЦЬ АБАРОНУ НАШАЙ РАДЗІМЫ

К. А. ШМЕЛЕЎ,
слесар-мадэльшчык.

Хачу сказаць пару слоў аб праве на асвету. У вёсцы бывала ў стары час два гады паходзіш у царкоўна-прыходскую школу, навучышся малітву чытаць і бацька ўжо забірае на заработкі.

Каля мяне жывуць студэнты ветэрынарнага інстытута — калгасныя хлопцы. Гляджу на іх і радуюся. Зусім не падобны на былых вяскоўцаў. Расце наша маладая совецкая інтэлігенцыя.

Па праўдзе кажучы, я і не думаў дажыць да такога шчаслівага жыцця. Я яшчэ здаровы чалавек, але-ж дзяржава ўжо мне плаціць пенсію, зменшылі мой рабочы дзень, а зарплата засталася што пры нармальным рабочым дні.

Безупынна ўзмацняць абарону нашай краіны — ганаровая задача для кожнага з нас. Калі хто-небудзь спрабуе напасці на нас, то мы, старыя, не адстанем ад маладых.

УБАЧЫЎ НОВУЮ ВЕСКУ

Ш. ФРЫДМАН,
слесар-інструментальшчык.

У мінулым годзе ўлетку я быў некалькі дзён у вёсцы. Зайшоў у адну хату, сядзяць два хлопцы. Прысеў я на лаўцы і прыслухоўваюся да іх размовы. Цікава было паслухаць, аб чым гутарыць калгасная моладзь. Чую, як адзін расказвае аб прачытанай ім заналта цікавай кніжцы. Дзяліліся ўражаннямі аб кінакарціне. Культура калгаснай вёскі ўзнімаецца з кожным днём. Права на асвету, культуру заваявана для працоўных нашым сацыялістычным ладам. Праект Канстытуцыі яшчэ больш гэта права замацоўвае.

Як мы калісьці карысталіся правам на працу? Гэта было ў 1915 г. Шукаючы работы, я заехаў у Самару. Трапіў на ваенны завод. Казалі, што там рабочых набіраюць. Падаў заяву ў кантору, мне сказалі: «Рабочыя-то патрэбны, але-ж вы яўрэй». Два тыдні хадзіў, абіваў парогі канторы і паехаў ні з чым.

У буржуазных газетах узняўся немалы спалох у сувязі з нашай Канстытуцыяй. Відаць, моцна мы ўдарылі па іх нашай сапраўды народнай Канстытуцыяй. Нашы поспехі не даюць ім спакою.

ЗА ПРАВА ПАДПІСАЦЬ ПІСЬМО ПРАВАДЫРУ НАРОДАЎ

Паміж спецыялістамі сельскай гаспадаркі **Будакашалёўскага** раёна шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзенне агратэхнічных і зоатэхнічных мерапрыемстваў у раёне і гэтым самым заваяваць права падпісаць пісьмо таварышу **Сталіну** ў дзень вызвалення Беларусі ад белапалякаў і гадавіны ўручэння БССР ордэна Леніна.

Спецыялісты ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па падняццю ўраджайнасці і развіццю сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Сярод абавязацельстваў ёсць такія, як палепшанне сенажацей і выпасаў для жывёлы, догляд за пасевамі, падрыхтоўка майстроў сіласавання, асушка забалочаных участкаў у калгасах, догляд за насеннымі ўчасткамі...

Вялікую ўвагу аддаюць спецыялісты падрыхтоўцы да ўборкі нароўга ўраджаю. Сюды ўваходзяць такія мерапрыемствы, як рамонт уборачных машын, падрыхтоўка кадраў, вылучэнне ў калгасах лепшых коней для ўборкі, падрыхтоўка гумнаў і складачных памяшканняў і т. д.

Апрача гэтага спецыялісты Будакашалёўскага раёна ўзялі на сябе абавязацельства — забяспечыць сістэматычную канкрэтную дапамогу і кіраўніцтва з боку спецыялістаў комсамольска-маладзёжнымі звеннямі ў калгасах, кожную дэкаду праводзіць вучобу з калгасным актывам па пытаннях агратэхнікі і зоатэхнікі, тры разы ў месяц праводзіць заняткі з трактарыстамі па пытанню агратэхнікі, забяспечыць сістэматычную дапамогу арганізаваным у раёне 12 хатам-лабараторыям у калгасах.

Самаабавязацельства падпісалі 12 спецыялістаў.

ШЧАСЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

Мітынг адпачываючых адкрыў парторг чонкаўскага дома адпачынку тав. Шэйнін. Ён гаворыць аб тым, што ва ўсіх кутках неасяжнага СССР абмяркоўваецца праект Канстытуцыі і адпачываючыя павінны сказаць аб ім сваё слова. Адразу-ж выяўляецца многа жадаючых чытаць яе перад масай. Па чарзе пункт за пунктам Канстытуцыю чытаюць адпачываючыя тав. Гітліц (Менск, фабрыка імя Кагановіча), Валатоўскі (настаўнік Капаткевіцкага раёна) і інш.

Чытанне прадаўжаецца паўтары гадзіны. Усе слухаюць з напружанай увагай. Мы бачым, як у некаторых паказваюцца слёзы радасці, якой нявыказанай радасцю свецяцца вочы людзей. Ва ўрачыстай цішыні гулка аддаюцца «Грамадзяне СССР маюць права на адпачынак» і цішыня прарываецца магутным прыбоем апладысментаў.

Выходзіць рабочы Гомсельмаша т. Галубоў. Ён гаворыць коратка, выразна, ад усяго сэрца, ледзь-ледзь запінаючыся ад хвалявання.

— Толькі ў нашай краіне рабочы і працоўны — ганаровы грамадзянін, толькі ў нас праца — вышэйшае шчасце і гэта права мы будзем абараняць цаной свайго жыцця. А права на адпачынак? Хто мог думаць са старых рабочых аб адпачынку, калі трэба было гнуць спіну за капейку. У гэтых дачах, што мы цяпер жывем, калісьці атрымлівала асалоду гомельская буржуазія. Цяпер дачы нашы, усіх працоўных. Для нас курорты, санаторыі, для нас палацы... Усё добра ў сталінскай Канстытуцыі, усё там прадумана.

Яркую, усхваляваную прамову сказаў настаўнік матэматыкі гомельскай сярэдняй школы імя Лібкнехта 68-гадовы Дзімітры Дзімітрыевіч Струнін. Яго, сівога старыка, маючага вялікі жыццёвы вопыт, слухалі з павагай і выключнай увагай.

— Я магу вам расказаць аб жыцці за палае поўстагоддзе, але вы не знойдзеце больш яркай старонкі, чым дні абмеркавання мудрай сталінскай Канстытуцыі. Настаўнік, як і рабочы, пры капіталізме быў на апошнім рахунку. Я шчасліў, што жыву ў такі цудоўны час. Ніяк не магу абыйсці моўчкі пункт, дзе гаворыцца аб праве на асвету. Ці ўяўляеце вы сабе, якое гэта велізарнае заваяванне чалавецтва. Можа некаторыя з вас памятаюць, як адзін царскі міністр звярыным голасам прарыкаў: «не месца кухарчыным дзецям ва універсітэтах».

Кухаркі цяпер навучыліся кіраваць дзяржавай. Радуецца маё сэрца, калі бачу шчаслівых, жыццерадасных дзяцей у школах, клубах—дзяцей розных нацыянальнасцей. Шчаслівыя бацькі, дзеці якіх нарадзіліся ў совецкі час.

Права на адпачынак, права на працу, права на асвету. Кожнае слова мае велізарнае палітычнае значэнне. Новая Канстытуцыя ўсе абдымная, гуманная і выразная, таму што ініцыятарам і творцам яе з'яўляецца таварыш Сталін.

Гэтыя словы настаўніка выклікалі буру аваў.

Выступіўшы т. Ланіцкі (з Магілеўскага трубалітэйнага завода) унёс прапанову ўключыць у Канстытуцыю спецыяльны пункт аб клопатах дзяржавы аб дзецях, якія не маюць бацькоў, а т. Ханудзін (менскі шклозавод «Пролетарый», прапанаваў пазбавіць права голасу служак рэлігійнага культу.

На мітынгу выступіў член прэзідыума ЦК МОПР БССР тав. Бейгельман, былы палітэмігрант, які ў змястоўнай прамове яркa і вобразна паказаў бяспраўе працоўных у капіталістычных краінах, якія знаходзяць у СССР сваю радзіму. Яго прамова прарывалася апладысментамі ў гонар правадыра германскай компартыі т. Тэльмана. Тав. Бейгельман расказаў аб канстытуцыйнай хлусні фашыстаў у капіталістычных краінах.

Аднадушна 508 адпачываючых у чонкаўскім доме адпачынку прынялі рэзалюцыю, у якой гаворыцца:

«Мы, адпачываючыя ў чонкаўскім доме адпачынку з вялікай радасцю вітаем і ўхваляем мудрую сталінскую Канстытуцыю, упвярджаючую магутнасць і веліч нашай соцыялістычнай радзімы...

Усім нам, нашым братам, сёстрам, мужам, бацькам, маткам і нашым дзецям забяспечана шчаслівае будучае. Для нас усё: школы, клубы, палацы, дамы адпачынку, культуры, для нас права на свабодную радасную працу, на адпачынак і асвету ў процілегласць праву на турму, голад і беспрацоўе ў капіталістычным свеце.

Усенароднае абмеркаванне Канстытуцыі супадае з набліжэннем 16-годдзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў. БССР стала перадавой ордэнаноснай рэспублікай, дзе ў дружбе жывуць працоўныя розных нацыянальнасцей. Усё гэта павялічвае нашу радасць.

Мы абяцаем пасля адпачынку з патроснай энергіяй працаваць на карысць сацыялістычнай радзімы, даўшай нам шчаслівае, радаснае жыццё. Калі вораг уздумае ашабрыць у нас гэта жыццё, мы ўсе як адзін станем на абарону граніц СССР.

Ад усёй душы мы радуемся, што творцам Канстытуцыі з'яўляецца наш любімы правадыр таварыш **Сталін**. Шчыра дзякуем роднага **Сталіна** за Канстытуцыю шчаслівай і любімай сацыялістычнай радзімы».

Н. ГАСМАН.

Чонкі, Гомель.

ПРАВА НА АДПАЧЫНАК...

«Добры дзень, мае дарагія Манечка, Алік і Боранька! Як вы ўсе жывеце? Знаходжуся ад вас, мае дарагія, вельмі, вельмі далёка — на Паўночным Каўказе. Прынялі мяне надзвычай добра. Наш санаторый пад назвай «Крэпасць» знаходзіцца ў самым цэнтры горада блізка ад парка. Гэта — выдатнае месца! Усе лячэбныя працэдуры — нарзанныя ванны і інш. — робяцца тут-жа,— не трэба нікуды хадзіць.

Сёння быў у галоўнага ўрача на прыёме. Ён мяне вельмі ўважліва агледзеў, трымаў мяне цэлую гадзіну, вызначыў нарзанныя ванны з заўтрашняга дня... Хочацца расказаць вам аб прыгожасці самаго горада Кіславодска і нашага санаторыя, але іх пяжка апісаць. Я поўны ўражаннямі. Адным словам— выдатна!».

Так піша ў пісьме да сваёй сям'і вадаправодчык магілеўскай шоўкавай фабрыкі імя Куйбышэва Давід Майсеевіч Сарокін, які адпачывае зараз на курорце ў Кіславодску. Давід Майсеевіч выехаў у Кіславодск 12 чэрвеня, у дзень, калі ва ўсіх газетах быў апублікован праект новай Канстытуцыі СССР. Ён чытаў гэты гістарычны дакумент ужо сёдзячы ў вагоне.

Сотні рабочых шоўкавай фабрыкі штогод адпачываюць у дамах адпачынку, у санаторыях, на курортах. Ужо да 20 чэрвеня г. г. фабрыка накіравала ў дамы адпачынку 581 чал., у мясцовыя санаторыі 33 чал., на курорты ў Крым і на Каўказ — 65 чал. Гэта менш чым за поўгода! Прыблізна столькі-ж рабочых і служачых будуць адпачываць такім-жа чынам і ў другой палове года. Ці не лепшым пацвярджэннем 119 артыкула праекта Канстытуцыі з'яўляюцца гэтыя лічбы?

20 мая фабрыка спынілася на рамонт. Трэба было паслаць у дамы адпачынку звыш 200 рабочых, а ў распараджэнні фабрыкі — толькі 43 путёўкі. І вось, па рашэнню фабрычных арганізацый, літаральна за 4—5 дзён быў пабудаван свой фабрычны дом адпачынку. Мабілізавалі ўсе сілы, адпусцілі патрэбныя сродкі. 200 рабочых культурна і карысна адпачылі. Перад выхадам з дома адпачынку рабочыя паслалі ў фабрычную шматтыражку «Чырвонае верацяно» бліскучы водгук аб яго рабоце. Вось што яны пісалі:

«Заўтра, пасля 2-тыднёвага прабывання ў фабрычным доме адпачынку, мы выходзім на работу. Мы выдатна адпачылі, паправіліся. Смачныя, сытныя абеды, чыстата і парадак у пакоях, весела праведзены час — усё гэта пакінула добрае ўражанне аб нашым доме адпачынку. На клопаты аб нас з боку трыкутніка фабрыкі і фабрычных арганізацый адкажам стаханаўскай работай на вытворчасці».

***

Яшчэ некалькі фактаў і лічбаў.

У Салтанаўцы, у сасновым бару, на прыгожым жывапісным месцы будуецца вялікі дом адпачынку для рабочых шоўкавай фабрыкі. Пабудова будзе закончана да 19 гадавіны Вялікай пролетарскай рэвалюцыі. Прапускная здольнасць дома адпачынку — 1.200 чал. у год. Кошт будаўніцтва — 300 тысяч рублёў.

У 1936 годзе фабком шоўкавай фабрыкі выдаткоўвае на культурнае абслугоўванне рабочых 130 650 рублёў. Такую-ж, прыблізна, суму адпускае дырэкцыя фабрыкі на паляпшэнне культурна-бытавых умоў.

Дырэкцыя фабрыкі вылучыла са звышпланавых накапленняў 75 тысяч рублёў на рамонт рабочых кватэр. У першую чаргу кватэры будуць рамантавацца лепшым стаханаўцам фабрыкі.

***

Частка рабочых фабрыкі засталася адпачываць у горадзе. Аб іх таксама паклапаціліся фабрычныя арганізацыі. Перад намі ажыццёўлены план масава-культурных мерапрыемстваў па абслугоўванню рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых шоўкавай фабрыкі, адпускнікоў і рамонтнікаў у перыяд з 20 мая па 6 чэрвеня.

«20 мая. У клубе фабрыкі — гукавы кінофільм «Чапаеў».

21 мая. У клубе Буйнічы (рабочы пасёлак фабрыкі) — кінофільм «Горад у стэпу». У клубе фабрыкі — вечар самадзейнасці Магілеўскага педінстытута.

22 мая. У клубе фабрыкі танцавальны вечар.

23 мая. У клубе — гукавы кінофільм «Падругі». Днём — масавае катанне на лодках.

24 мая. Удзел фабрыкі ў раённай палітмасоўцы ў Пячэрску. У клубе фабрыкі кінофільм «Падругі». У клубе Буйнічы кінофільм «Дачка партызана».

25 мая. У доме Чырвонай арміі творчая справаздача Магілеўскай музыкальнай школы перад стаханаўцамі фабрыкі.

І так далей і так далей. Ні адзін дзень, ні адзін вечар не застаўся незапоўненым. Рабочыя весела, культурна і радасна правялі свой час адпачынку. І гэта не толькі ў дні водпуску! Так кожны дзень. Пасля работы рабочыя маюць магчымасць добра адпачыць. Штомесяц у фабрычным клубе дэманструюцца 15—16 кінофільмаў (у большасці гукавых). У клубе пасёлка Буйнічы, дзе жывуць 350 рабочых фабрыкі, дэманструюцца 10—12 кінофільмаў у месяц.

У астатнія вечары праводзяцца іншыя масавыя мерапрыемствы: масоўкі, гулянні, экскурсіі, вечары самадзейнасці, катанні на лодках, калектыўныя паходы ў тэатр і т. д.

На фабрыцы разгортваецца рабочая самадзейнасць. Працуюць музыкальны, літаратурны гурткі. Драматычны гурток ставіць такія п'есы, як «Прафесар Мамлок» «Шэспера любімых», «Вранье» і інш. Шахматна-шашачны гурток часта арганізуе турніры. Гэтымі турнірамі цікавіцца значная частка рабочых.

Фабрыка мае сваю водную станцыю — 35 лодак, 2 гоначныя байдаркі, 3 пары гідралыж. Нядаўна дырэкцыя адпусціла 20.000 рублёў на даабсталяванне водная станцыі і набыццё далатковага інвентару.

Так ажыццяўляюць рабочыя шоўкавай фабрыкі сваё права на адпачынак, так рэальна праводзіцца ў жыццё артыкул 119 сталінскага праекта Канстытуцыі.

Права на адпачынак у нашай шчаслівай, квітнеючай краіне забяспечана.

С. ГАЛКІН.

Магілеў.
Шоўкавая фабрыка.

Дыспетчар гомельскага аддзялення чыгункі ордэнаноска Вілетнікава адпачывае ў Клёнкаўскім доме адпачынку каля Гомеля. НА ЗДЫМКУ: Тав. Вілетнікава (справа) катаецца на лодцы.

Фото Соркіна.

НЕПРЫСТУПНЫ ФАРПОСТ НА ГРАНІЦЫ

★

ЖОЛУДАЎ

Старшыня Слуцкага акрвыканкома.

★

Прымежныя акругі, у тым ліку і Слуцкая, створаны па ініцыятыве нашага вялікага **Сталіна** для ўмацавання заходніх рубяжоў краіны Совецкаў, для таго каб стварыць магутны непрыступны фарпост на граніцы з капіталістычным Захадам.

Прайшло поўгода. За гэты час оргбюро ЦК КП(б)Б і оргкамітэт ЦВК БССР па Слуцкай акрузе прарабілі вялікую рознастайную работу па выкананню тых задач, якія былі пастаўлены перад партыйнымі і непартыйнымі большэвікамі Случчыны ў сувязі са стварэннем акругі.

Стварэнне акругі станоўча адбілася на ўсім гаспадарча-палітычным жыцці Случчыны. Паспяховае правядзенне веснавой сяўбы, магутная хваля стаханаўскага руху ў калгасах, барацьба лепшых людзей акругі за ўздым сацыялістычнай жывёлагадоўлі — усё гэта вынік кансалідацыі партыйных сіл на граніцы, вынік умацавання совецкаў, вынік стварэння акругі.

Стварэнне акругі спрыяла таксама ўзмацненню абарончай работы ў соўгасах і калгасах і на прадпрыемствах.

Перад намі стаіць задача ператварэння кожнага прадпрыемства, кожнага соўгаса, кожнага калгаса ў непрыступную крэпасць абароны. На першых поспехах у гэтай справе я хачу падрабязна спыніцца.

У акрузе працуе 340 пярвічных арганізацый Асоавіяхіма, якія налічваюць 9 тыс. чалавек прапоўных, 1.100 жанчын актыўна працуюць у асоавіяхімаўскай арганізацыі. У 184 стралковых гуртках займаецца 3.900 чалавек. На сённяшні дзень у акрузе налічваецца 1.600 варашылаўскіх стралкоў першай ступені. 1.440 чалавек займаюцца ў гуртках процівапаветранай абароны. 625 чалавек прапоўных прымаюць удзел у 33 ваенізаваных паходах у процігазах.

У калгасах створана 39 ваенізаваных канюшань. У гуртках варашылаўскіх кавалерыстаў займаецца 500 чалавек.

Пачынаючы з 1936 года, абарончая работа ўвесь час ідзе ўверх. Калі паглядзець, што хаваецца за прывезенымі лічбамі, то стане зразумела, што мы маем справу з вялікім атрадам людзей, аўладаўшых і авалодваючых ваеннай тэхнікай.

Вельмі характэрна, што многія вайсковыя гурткі сталі перахозіць ад простага вывучэння вінтоўкі, процігаза да рашэння ваенных задач. Асаблівая цяга да тэхнічных заняткаў наглядаецца ў ваенных гуртках Капыльскага, Ч.-Слабодскага і інш. пагранічных раёнаў.

Калі раней мы зварачалі галоўную ўвагу на іх рост, то цяпер галоўныя нашы клопаты — гэта добра арганізаваць работу кожнай пярвічнай арганізацыі Асоавіяхіма, кожнага стралковага гуртка, кожнай групы варашылаўскіх кавалерыстаў. Мы, напрыклад, да таго часу не зацвярджаем тых груп варашылаўскіх кавалерыстаў, якія не маюць ваенізаванай канюшні, пастаянна прымацаваных коней і патрэбнага інвентару.

Пярвічныя партарганізацыі, сельсоветы, праўленні калгасаў сталі зварачаць вялікую увагу на абарончую работу. Старшыня Вяліка-Раеўскага сельсавета, Капыльскага раёна, т. **Сямашка**, старшыня Макранскага сельсавета, Ч.-Слабодскага раёна, т. **Бяляеў** асабіста сочаць за работай вайсковых гурткоў, дагаворваюцца з пагранічнымі вайсковымі часцямі аб вылучэнні кіраўнікоў і інструктароў ваеннай вучобы.

Дырэктар соўгаса «15-годдзе БССР», Любаньскага раёна, ордэнаносец тав. **Прорвіч** аказвае вялікую штодзённую дапамогу ваенна-асоавіяхімаўскаму атраду соўгаса. Планерны гурток соўгаса падрыхтаваў без адрыву ад вытворчасці 10 планерыстаў.

У адным толькі калгасе «Новы шлях», Грэскага раёна, стралковай справай займаецца 40 чал. Нормы на варашылаўскага стралка першай ступені здалі 12 калгаснікаў, у гуртку варашылаўскіх кавалерыстаў навучаюцца 22 чалавекі.

Члены Асоавіяхіма соўгаса «Чырвоны пагранічнік», Старобінскага раёна, тт. **Бабок, Леўчыц** за актыўную барацьбу з парушальнікамі граніцы ўзнагароджаны ПС АСО БССР імянной зброяй і значкамі «Актывіст».

Такіх прыкладаў можна прывесці вельмі многа. Але мы лічым, што ўсё гэта толькі першыя кроні. Кожны прапоўны павінен аўладаць вінтоўкай і процігазам. Тысячы калгаснікаў павінны навучыцца кіраваць канём.

Гэта вялікая і адказная задача. Мы павінны яшчэ вышэй узняць абарончую работу, яшчэ больш узняць пільнасць кожнага прапоўнага ў адносінах да ворагаў, шпіёнаў, дыверсантаў, парушальнікаў совецкіх граніц.

ВОПЫТ РАБОТЫ СЕЛЬСКАЙ ПЯРВІЧНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

★

Ніжэй мы публікуем артыкул аб вопыце работы сельскай пярвічнай партыйнай арганізацыі. Урэцкая партыйная арганізацыя невялікая — 6 членаў і 5 кандыдатаў партыі. Але кожны комуніст са сваёй арганізатарскай і прапагандысцкай работай карыстаецца вялікай папулярнасцю і любоўю ўсіх калгаснікаў. Вопыт работы урэцкай пярвічнай партыйнай арганізацыі варты, каб перанесці яго ў іншыя пярвічныя арганізацыі.

★

Партыйнага арганізатара Коршука і комуніста Швеца звязвае вялікая дружба. Часта іх можна сустрэць за сумеснай чыткай якога-небудзь артыкула «Правды», за разборам найбольш цяжкіх для Швеца пытанняў бягучай палітыкі.

Коршук ганарыцца сваім выхаванцам. Швец у сваю чаргу шчыра паважае парторга за яго чуласць, уменне падыйсці да кожнага члена партыі, і, галоўнае, за яго скромнасць.

А заралзілася гэтая дружба ў сумеснай вучобе і рабоце. Яшчэ год таму назад Швец мог чытаць толькі па складах. Вельмі нізкай была і яго палітычная падрыхтоўка. Парторга гэта хвалявала і ён парашыў узяць Швеца пад свой асабісты нагляд. Хлопцу дапамаглі праца над падручнікам, далі яму пэўныя пачатковыя веды пісьменнасці, навучылі складаць канспект.

Цяпер і парторг і прапагандыст пасля кожных партзаняткаў з радасцю адзначаюць рост свайго выхаванца. І хаця Швец у гуртку па гісторыі партыі паспявае лепш за ўсіх, тым не менш ён і зараз даволі часта прыходзіць да парторга са шматлікімі запытаннямі.

У партыйным жыцці Швец таксама прымае актыўны ўдзел. У час сяўбы ён па два разы ў дзень бываў у прымацаваным да яго калгасе імя Сталіна, дзе праводзіў гутаркі і чытаў газеты ў брыгадах, дапамагаў выпускаць насценгазеты.

Многа дапамагае партгрупа члену партыі тав. **Радабольскаму** і кандыдату **Крамарэнка**. Абодва яны адстаюць у партыйнай вучобе—занадта ў іх малая падрыхтоўка. І да абодвух партгрупа прымацавала больш моцных таварышоў для дапамогі ім у вучобе. Комуністы Міраносаў і Усовіч вельмі сумленна адносяцца да работы з «падшэфнымі» ім таварышамі.

Пытанні партыйнай прапаганды не зыходзяць у партарганізацыі з парадку дня. Тав. Коршук увёў, як правіла, што пасля кожных заняткаў прапагандысты дакладваюць яму, як была прапрацавана слухачамі тэма. У выпадку якога-небудзь прарыву ў заняткахскліканца вытворчая нарада слухачоў сумесна з прапагандыстамі.

Так, апошняя нарада разглядала прычыны пропуску заняткаў некалькімі комуністамі і пытанні методыкі самападрыхтоўкі да партыйнай асветы. Шырока абмеркавалі на нарадзе хвалюючае ўсіх пытанне— як лепш рыхтавацца да заняткаў, індывідуальна ці калектыўна. Прышлі да думкі, што гэта залежыць ад індывідуальных асаблівасцей кожнага слухача і таму калектыўная падрыхтоўка да заняткаў была дазволена, наперакор таварышам, якія хацелі яе забараніць.

Партарганізацыя часта слухае самасправаздачы комуністаў аб іх вучобе. Перад кожнай такой справаздачай вылучаецца група таварышоў, якія дакладна вывучаюць канспекты і запісы комуніста, высвятляюць, што ён чытае і як засвойвае. Прапагандыст робіць на сходзе суда-клад аб вучобе таго комуніста, якога партарганізацыя слухае.

Умела пастаўлена і партыйная агітацыя. Кожны комуніст прымацаван да аднаго з калгасаў. Да найбольш буйных калгасаў прымацавана па два таварышы. На кожным партыйным сходзе комуністы інфармуюць аб праробленай у калгасах рабоце.

Не задавольваючыся аднымі толькі гутаркамі ў брыгадах і звеннях, партыйная арганізацыя арганізавала ў трох буйнейшых соўгасах палітшколы бягучай палітыкі. Звыш 100 чалавек калгаснага актыва навучаліся ў гэтых школах.

Кожны комуніст ведае, што пастанова партыйнага схода—гэта непарушны закон. Ведаюць яны і тое, што за кожную даручаную справу трэба адчытацца перад партыйнай арганізацыяй. Робіцца гэта звычайна так. Парторг за некалькі дзён да сходу правярае як выкананы ўсе папярэднія пастановы і рашэнні і дакладвае аб гэтым сходу. Комуністы ў сваю чаргу робяць кароткія інфармацыі аб выкананні даручаных ім заданняў.

І так на кожным сходзе. Невыкананне партыйных даручэнняў— тут рэдкае з'явішча.

Урэцкая пярвічная партыйная арганізацыя па сваёй колькасці невялікая. Складаецца яна з 6 членаў і 5 кандыдатаў партыі. У групе спачуваючых 7 чалавек. Гэта лепшыя людзі калгасаў. Тут навучыліся падыходзіць да кожнай справы прынцыпова, ідэйна, удумліва.

Урэцкая пярвічная партыйная арганізацыя мае цэлы рад недахопаў. Але ёсць вялікае жаданне і ініцыятыва ў парторга т. Коршука і ва ўсіх комуністаў ліквідаваць недахопы і прапаваць узорна.

Я. ГЕРЦОВІЧ

Слуцкі раён.

АБУРАЮЧАЯ ГІСТОРЫЯ

(Пісьмо работніка раённай газеты)

Вера **Будзько** — батрачка з маленства. Да замужаства жыла пры жанатым браце. Гаспадарка бядняцкая. Зямлі мала. І вось у 1926 годзе брат з братавай угаварылі яе выйсці замуж за Пашуту Парфена — чалавека на 20 гадоў старэйшага за яе, але з моцнай гаспадаркай.

У новай сям'і Веру сустрэлі варожа, зненавідзелі за беднасць. Залоўка (сястра мужа) нават пазбавіла яе права паліць у печы Веру прымусілі пасвіць жывёлу.

Праз два гады Вера запяжарыла. Нарадзіўся сын. Гэта ніколькі не змяніла яе становішча ў сям'і. Яна па-ранейшаму касвіла ў балоце жывёлу. Дзіцё ёй дазвалялі трымаць на руках толькі тады, калі яна карміла грудзьмі.

Далей пайшло яшчэ горш. Сын Валодзя падрастаў і не ведаў сваёй маці. Ён ведаў толькі батрачку «Верку», «бабу», якая павінна рабіць у гаспадарцы ўсю чорную работу і якую кармілі **«па норме»**.

На дзевятым годзе «супольнага» жыцця, у 1935 годзе, Вера не вытрымала, пакінула свайго мужа і паступіла прыбіральшчыцай у кантору райаддзялення «Заготлён». Сына ёй не далі.

Уся гэта дзікая гісторыя адбывалася пад бокам у Пацкага сельсовета (хутар «Начка-Ільіна», Ветрынскі раён). Не пацікавіўся жыццём Веры Пашута і загадчык канторы «Заготлён» Казакевіч. А бедная жанчына, запалоханая з малых гадоў, не асмеліцца паскардзіцца, што ў яе аднята самае дарагое — сын.

А хіба ж партыйныя і совецкія арганізацыі Ветрынскага раёна не нясуць за гэта адказнасць? Хіба яны не вінаваты ў гэтай трагедыі?

СЕМАШКА.

СЕЛЬСОВЕТ НЕ ДАЕ ДАКУМЕНТАЎ

(Пісьмо вучня)

У пачатку чэрвеня я звярнуўся да загадчыка рэчыцкага раённага аддзела народнай асветы з тым, што старшыня Какусвіцкага сельсовета **Лапацін** не выдае мне неабходных для паступлення ў сярэднюю школу дакументаў. На маёй заяве загадчык райана напісаў Лапаціну, што дакументы неабходна выдаць. Але старшыня сельсовета ўсё-ж дакументаў не даў.

— Хай хто піша, той і выдае,— гаворыць ён.

Такім чынам, я не маю магчымасці далей вучыцца.

КЛІМЯНОК.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«БЛІЗАРУКАСЦЬ ГОРАЦКІХ КІРАЎНІКОЎ»

Пракурор Горацкага раёна тав. Свярдлоў паведаміў нам, што адзначаныя факты ў змешчаным пісьме ў «Звяздзе» калгасніка тав. Луцакова пад загалоўкам: «Блізарукасць горацкіх кіраўнікоў», праверены на месцы.

Справа скончана і накіравана на разгляд нарсуду раёна па абвінавачванню былога брыгадзіра калгаса «Чырвоны сцяг» (Горскі сельсовет) Емельянава Паўла.

Гастролі харкаўскага тэатра імя Т. Г. Шэўчэнка ў Менску

Тэатр высокай культуры

ПАСЛЯ ПЕРШЫХ СУСТРЭЧ З ГЛЯДАЧОМ

Гутарка з мастацкім кіраўніком харкаўскага тэатра імя Шэўчэнка заслужаным артыстам УССР тав. М. М. Крушэльніцкім

Харкаўскі тэатр імя Шэўчэнка прыехаў у Менск упершыню. Таму мы, збіраючыся на гастролі ў Менск адчувалі асаблівую адказнасць за прадстаячую нам работу, бо мы ведалі, што ў Менску нас сустрэне даволі кваліфікаваны глядач.

Калі мы ехалі ў Менск, нас пэўным чынам палохала думка, што менскі глядач не ведае украінскай мовы і гэта будзе тармозіць успрыняцце ім нашых спектакляў.

Аднак нашы апасенні былі дарэмны. Першыя ўжо спектаклі паказалі нам, што глядач выдатна разумее ўкраінскую мову і ніякіх тормазаў у эмацыянальным успрыняцці нашых спектакляў няма. Мы не адчулі ніякай асаблівай розніцы ў гэтых адносінах паміж харкаўскім глядачом і менскім. Гэта гаворыць аб тым, што тэатр знайшоў патрэбную сцэнічную мову, якая ляжыць у плоскасці агульных і інтэрнацыянальных ідэй. Такая мова аднолькава зразумела і аднолькава хвалюе як украінскага, так і беларускага глядача. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што самае галоўнае, дамініруючае ў мастацтве — гэта ідэя, змест.

Па ходу нашых спектакляў мы штодзенна пераконваемся, што менскі глядач расце з кожным днём у той-жа ступені, як растуць усе глядачы ў нашай краіне. Гэта — выдатны глядач, глядач высокай культуры, высокага пачуцця. Рэакцыі яго вельмі правільныя. Глядач заўсёды горача адгукваецца на асабліва хвалюючыя ідэйна-палітычныя эпізоды. Вось, напрыклад, у спектаклі «Платон Крачэт» — калі Бэрэст спыняе Аркадзія, глядач дружна апладыруе. Так у Менску, так і ў Харкаве.

Мы адчуваем сябе на спектаклях як дома, нібы глядач нас даўно ўжо ведае і прывык да нашых пастановак. Гэта дае нам большую ўпэўненасць у правільнасці рашэнняў нашых спектакляў, асабліва ў правільнасці ідэйных рашэнняў. Мы адчуваем шчырую ўсхваляванасць у глядальнай зале, усхваляванасць, якая не з'яўляецца толькі рэзультатам гаспіннасці.

Нам было-б вельмі цікава сустрэцца з глядачом не толькі са сцэны, але так, каб мы маглі пачуць аб'ектыўную крытыку глядача нашых пастановак. Гэта крытыка прынесла-б нам велізарную карысць.

На жаль, мы не маем магчымасці сустрэцца тут з работнікамі беларускіх тэатраў, паколькі яны ўсе цяпер у раз'ездзе. Мы спадзяемся, што будзем мець сустрэчу з іншымі работнікамі мастацтва (пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі і інш.). Для нас гэтыя сустрэчы тым больш важны, што мы— напярэдадні вельмі адказнай паездкі на міжнародны фестываль. На гэты фестываль едуць толькі 2 нацыянальныя тэатры — наш і грузінскі. Думка і заўвагі менскай грамадскасці для нас маюць вялікую каштоўнасць.

У сувязі з падрыхтоўкай да фестываля мы часткова перарабляем п'есу «Гібель эскадры». Гэты спектакль мы паказваем на фестывалі. Пераапрацоўка ідзе па лініі новага рашэння афармлення спектакля і новага рашэння асобных сцэн. Мы падымаем гэты спектакль да вялікага рэволюцыйнага палатна, робім спектакль «Гібель эскадры» такім, каб ён змог увайсці ў рады спектакляў совецкай драматургічнай класікі.

Над чым працуе зараз наш тэатр? Мы прыступаем да рэпетыцыйных работ над п'есай з украінскай класікі — «Дай сэрцу волю, заязде ў няволю» — Крапіўніцкага.

Поўгода, як тэатр працуе над спектаклем «Кароль Лір» — Шэкспіра. Мы пакажам яго ў канцы будучага зімовага сезона.

У Менск у першых лічбах лінея прыязджае украінскі драматург тав. Карнійчук, які зачытае нам сваю новую п'есу.

Мы намецілі таксама да пастаноўкі «Грозу» Остроўскага, над якой пачнем работу увосень бягучага года.

Вельмі цікава было-б нам азнаёміцца з драматургічнымі творамі БССР і выбраць адсюль добрыя, найбольш каштоўныя творы для нашага тэатра.

СЛОВА РАБОЧАГА ГЛЯДАЧА

ПРАЎДЗІВА ПАКАЗАН КУЛАК

З вялікай прыемнасцю я ўпершыню глядзеў пьесу «Мартын Баруля» у пастаноўцы украінскага тэатра імя Тараса Шэўчэнка. Выключнае ўражанне ў мяне засталося ад праўдзівага паказу кулака, яго псіхалогіі, яго імкненняў да нажывы, імкнення выбіцца ў чыны, у дваранства.

Мяне хвалюе ігра актора, які выконвае ролю Мартына Барулі. Ён стварыў сапраўдны вобраз кулака, моцны, праўдзівы вобраз. Так і бачыш на сцэне ворага працоўных, якому, як паветра, патрэбна нажыва, эксплаатацыя.

Рабочы завода «Большэвік» ФЛЮКСМАН.

ЦІКАВЫ І ПРАЎДЗІВЫ СПЕКТАКЛЬ

Пастаноўка «Васа Жалезнова» па раману М. Горкага мне вельмі спадабалася. У ёй умела паказаны распад дваранска-купецкай сям'і і прычыны гэтага распаду.

У пастаноўцы ярка і характэрна відаць мінуўшчына. Момант выкарыстання прыгоннай сялянкі для розных цёмных спраў (атручванне дзядзькі) і інш запамінаецца надоўга.

Я шкадую, што не бачыў іншых пастановак гэтага тэатра. Пасля прагляду п'есы «Васа Жалезнова» мне яшчэ больш хочацца чытаць творы М. Горкага.

Стаханавец завода імя Молатава ЗУСМАНОВІЧ.

НА СЦЭНЕ — ЖЫВЫЯ ЛЮДЗІ

Мне ў тэатры імя Шэўчэнка прышлося бачыць «Партрэт» Афінагенава. У гэтым спектаклі ёсць рад цікавых і глыбокіх момантаў. Да іх я адношу і момант перавыхавання чалавека (начальнік цэха). Добра паказана комсамолка. Яна на сцэне такая, якіх у нас сустракаеш на кожным кроку.

Трэба адзначыць, што ўкраінскі тэатр — тэатр высокай культуры. Ігра актораў заслугоўвае асаблівай увагі. Да нелахопаў трэба аднесці хуткае вымаўленне слоў некаторымі акторамі. Скорагаворка зацямняе чыстату і выразнасць слова.

Рабочы завода «Большэвік» ІЦЫНКЕВІЧ.

„ГІБЕЛЬ ЭСКАДРЫ"

(П'еса А. Карнейчука. Пастаноўка рэжысёра Б. ЦЯГНО)

1918 год. Маладая совецкая рэспубліка перажывае крытычны перыяд. Контррэволюцыя арганізуе свае сілы для звяржэння першай у свеце дыктатуры пролетарыята. Украінскія нацыяналісты стваралі сваю контррэволюцыйную цэнтральную раду, збіраючыся оптам прадаць краіну нямецкім акупантам.

Совецкая рэспубліка дабіваецца мірнай перадышкі. Перадышка неабходна для ўмацавання дыктатуры пролетарыята, для арганізацыі яе сіл супроць нарастаючай знешняй і ўнутранай контррэволюцыі.

Пры такім становішчы чорнаморская эскадра аказалася адрэзанай ад рэволюцыйнага цэнтра, пазбаўленай сувязі з Масквой, з Леніным. Большэвікі Чорнага мора вядуць адважную барацьбу з украінскімі нацыяналістамі і манархісцкім камандаваннем эскадры, якія імкнуцца затрымаць флот у Севастопалі, каб перадаць яго немцам для барацьбы з рэволюцыйнай Расіяй.

Немцы наступаюць. Кайзераўскія ўльтыматумы становяцца ўсё больш наглымі. Нарэшце генерал Эйхгорн адкрыта і ўльтыматыўна патрабуе ад Совецкага ўрада перадачы эскадры нямецкаму камандаванню. У эскадры выспявае змова манархістаў і украінскіх нацыяналістаў-«самастійнікаў» з мэтай фізічнага знішчэння большэвіцкага камітэта, расправы з рэволюцыйнымі матросамі і перадачы эскадры немцам.

Выйсця няма. Большэвіцкі камітэт чакае дырэктывы з цэнтра. На эскадру прыбывае дэлегат балтыйскага флота. Ён перадае камітэту дырэктыву Масквы — **патапіць баявыя караблі,** каб яны не трапілі ў рукі ворага. Адбываецца жорсткая барацьба ўнутры камітэта. У дэлегаце балтыйскага флота падазраюць правакатара. Яго арыштоўваюць.

У гэты напружаны момант прыбывае шыфраваная тэлеграма за подпісам **Леніна,** якая пацвярджае распараджэнне аб патапленні эскадры.

Адзін за другім, з узнятымі сігнальнымі знакамі «гіну, але не здаюся», ідуць на дно баявыя караблі чорнаморскай эскадры. Загад партыі выканан. Эскадра ворагу не дасталася. Рэволюцыйныя матросы, узброеныя вінтоўкамі, кулямётамі, слаўнымі штандарамі загінуўшых караблёў, ідуць на сушу, на смяротную барацьбу за справу пролетарыята.

Гэта гераічная эпапея з эпохі грамадзянскай вайны бліскуча адлюстравана ў мастацкай форме ў п'есе таленавітага украінскага драматурга **А. Карнійчука** «Гібель эскадры». Пастаўленая Харкаўскім дзяржаўным драматычным тэатрам імя Шэўчэнка п'еса карыстаецца вялікім і зусім заслужаным поспехам у пролетарскага глядача.

Рэжысёр **Барыс Цягно** паставіў гэту п'есу з вялікім майстэрствам. Таленавітыя калектыў тэатра здолеў даць праўдзівыя, пераканаўчыя вобразы герояў—удзельнікаў гэтага гістарычнага эпізода класавай барацьбы.

Асаблівае ўражанне пакідаюць у глядача вобразы **Гайдая** (заслужаны артыст рэспублікі **Бучма**), **Стрыжня** (заслужаны артыст рэспублікі **Мар'яненка**), боцмана **Бухты** (артыст **Хадкевіч**).

З вялікай мастацкай сілай выкананы ролі контрадмірала **Гранатава** (артыст **Мілютэнка**), боцмана **Кобзы** (артыст **Сердзюк**).

Артыстка **Ужвій** здолела выдатна выканаць ролю **Аксаны** — баявой жанчыны-большэвічкі.

Незабыўна сцэна развітання з караблямі рэволюцыйных маракоў, якія самі, у імя рэволюцыі, адсылаюць іх на дно. Гэта сцэна, як і многія іншыя (сустрэча дэлегата Балтыйскага флота, смерць камісара, забойства Аксаны) наэлектрызоўваюць глядзельную залу.

Спектакль «Гібель эскадры» гаворыць аб высокай культуры тэатра імя Шэўчэнка, аб яго вялікіх магчымасцях да далейшага творчага росту.

А. ЯРАВЫ, С. ГАЛКІН.



Дзяржаўны ўкраінскі драматычны тэатр імя Шэўчэнка ў Менску. НА ЗДЫМКУ: сцэна з першага акта п'есы «Платон Крачэт», у ролі Платона артыст А. І. Сердзюк, у ролі Ліды артыстка В. Н. Чысцякова.



Удзельнікі брыгады мастацкай самадзейнасці Хойніцкай МТС тт. Жыўчук Л. А. і Лявіцкі Я. Ш. выконваюць беларускі народны танец «Лявоніху».
Фото Каплінскага.

НА СЕНАЎБОРЦЫ

У СТАНЕ БРЫГАДЫ СУЛЬЖЭНКІ

На невялічкім бугарку, сярод прасторaў сенажаці калгаса «Пролетарый № 1» за два дні з'явілася маленькае паселішча. І людзі, што жывуць тут, забяспечаны «жыллёвымі будынкамі», неабходным інвентаром і прыладамі. У самым «цэнтры», падобныя да стрэхаў хат, дзве павеці, зробленыя з пруцця і пакрытыя сенам. Кругом стаяць вазы, у вялікіх мяшках — бульба, у маленькіх — крупы, сала і іншыя запасы харчавання, чыста вымытыя міскі, лыжкі.

Гэта стан касцоў першай брыгады, брыгадзірам якой з'яўляецца ўдзельніца ўсебеларускай нарады перадавікоў ураджайнасці **Сульжэнка Агафія.** Яна прыехала сюды з брыгадай, за 15 кілометраў ад калгаса, скасіць і застагаваць сена.

Як толькі пачынае світаць, у маленькім паселішчы, хто з касой, хто з граблямі, з насілкамі ўходзяць на працу.

Ад рання і да позняга вечара кіпіць ударная праца. Кожны стараецца заняць першае месца. Лепшыя ўзоры працы, не толькі на сенажаці, але і на ўсякай рабоце, паказваюць Ціток Хведар, Грыдчанка, Тамілка Фядос, Тамілка Андрэй, Бандарэнка Апанас. Яны з дня ў дзень перавыконваюць нормы выпрацоўкі ў два разы, скашваюць па 0,80 гектара замест нормы ў 0,40.

***

Вечар. Пачынае цямнець. Маленькае паселішча зноў напаўняецца людзьмі. Адны вараць вячэру, другія запасаюць дровы. А маладыя, жыццерадасны Ціток Хведар паспеў ужо арганізаваць хор.

— Мы стаханаўцамі сталі,
Любім труд свабодны свой,
Нас вядзе таварыш Сталін —
Большэвіцкі рулявой
— пачынае Ціток.

За ім дружна падцягваюць Тарасенка Соня, Сідарок Соня, Тамілка Андрэй, Тамілка, Хведар, Грыдчанка Кірыла і другія:

— Кудры ўюцца, кудры ўюцца,
Кудры кольцамі;
Па-стаханаўску працуем з комсамольцамі.

— Мы ў шарэнзе з авангардам
Знаем: цэль верна,
За 7—8 міліярдаў
Залатых пудоў зярна.

Праходзіць гадзіна. Паспявалі, павесяліліся, павячэралі. Усе садзяцца навокал агня, вывучаюць праект новай сталінскай Канстытуцыі. Сюды, на стан, прыехаў прадстаўнік РК КП(б)Б, старшыня сельсовета. Тут, на стане, і кіраўнік калгаса тав. **Жылян.** Кожны раздзел, кожны артыкул сталінскай Канстытуцыі ўважліва і падрабязна разбіраюць, горача абмяркоўваюць.

Пасля абмеркавання праекта Канстытуцыі чутны словы:

— Дзякуй таварышу Сталіну за заможнае, вясёлае і радаснае жыццё, за яго клопаты аб жанчыне, аб старых і ўсіх працоўных!

Стары, што сядзеў падпершыся плячыма да сцяны павеці, уздыхнуў і прамовіў:

— Раней і за чалавека нас не лічылі, так і казалі — паляшукі мы, а не людзі... Цяпер мы — чалавекі. Ды не абы якія, а людзі вялікай дзяржавы, якая будуе радаснае, сацыялістычнае жыццё.

Мак. БУРДЫКА
калгас «Пролетарый № 1», Стралічаўскага сельсовета. Хойніцкі раён.

ВОПЫТ ЛЕПШЫХ КАСЦОЎ НЕ ПАПУЛЯРЫЗУЮЦЬ

БЕШАНКОВІЧЫ. **(Ад спец. кар. «Звязды»).** Абмеркаванне праекта сталінскай Канстытуцыі ўзнімае новую хвалю энтузіязма і актыўнасці сярод калгаснікаў раёна. У адказ на гэты гістарычны дакумент, наскрозь прасякнуты сталінскімі клопатамі аб жывым чалавеку, рад калгаснікаў паказвае сапраўды стаханаўскія метады работы, у прыватнасці на сяўбе.

Калгаснік калгаса «Чырвоная зорка» т. **Ткачонак Васіль** замест існуючай нормы 0,40 га выкашвае за дзень 1,20 — 1.40 га. **Белаус Кірыл, Надзежка Осіп** выкашваюць па гектару.

Такія стаханаўпы ёсць і ў іншых калгасах. Тт. **Усаў** і **Есіпаў** з калгаса імя Калініна выкашваюць кожны за дзень па 1.20 га замест нормы 0,40 — 0,30 га.

Аднак стаханаўская работа асобных калгаснікаў у радзе калгасаў не спалучаецца з правільнай арганізацыяй працы, з папулярызацыяй стаханаўскіх метадаў працы. У тым-жа калгасе «Чырвоная зорка» метад работы т. Ткачэнка не пераносіцца ў асяроддзе астатніх касцоў. Горш таго, касцы увесь час перакідваюцца на другую работу.

Там, дзе праца арганізавана правільна, дзе ўкаранена індывідуальная здзельшчына, там ёсць добрыя рэзультаты. І наадварот, работа скопам непараўнальна паніжае прадукцыйнасць працы.

У калгасе імя Фрунзе касцы тт. **Русін, Аўчыннікаў, Марозаў,** працуючыя ў парадку індывідуальнай здзельшчыны, сістэматычна выкашваюць за дзень па 0,90 га замест нормы ў 0,40. А працуючыя побач з імі на касьбе група калгаснікаў—Карась Іван, Карась Аляксей, Прышчэйка Іван ледзь выпрацоўваюць па 0,20 га. Гэтыя касцы працуюць скопам, адзін спадзяецца на другога. Многа часу ўходзіць у іх на перажуркі і гутаркі. Тое-ж самае і ў калгасе імя Чарвякова. Усе 6 касцоў, якія ёсць у калгасе, працуюць скопам і ледзь выконваюць устаноўленую норму.

— З такой работай плана сенакосу не выканаем, — заяўляе нам старшыня гэтага калгаса т. **Арцюх.** Аднак, ён сам нічога не робіць для таго, каб правільна арганізаваць працу касцоў, укараніць індывідуальную здзельшчыну.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што спаборніцтва ў гэтых калгасах не разгорнута. Масава-растлумачальная работа знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

АСВОІЦЬ ВЕНТЫЛЯЦЫЙНУЮ ГАСПАДАРКУ

На нашых сацыялістычных прадпрыемствах вентыляцыя, як важнейшы фактар аздараўлення ўмоў працы, мае першаступовае значэнне. У БССР на базе сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасці створана буйная вентыляцыйная гаспадарка. Да рэволюцыі на нашых прадпрыемствах не было ніводнай вентустаноўкі, а ў сучасны момант ёсць каля 200 буйных вентыляцыйных установак, коштам больш 10 млн. руб. Магутнасць матораў, абслугоўваючых вентыляцыю, дасягае 5 тыс. кілават. Асваенне гэтай буйнай вентыляцыйнай гаспадаркі з'яўляецца важнейшай задачай нашай прамысловасці.

Асабліва важную ролю набывае вентыляцыя для паспяховага развіцця стаханаўскага руху. Інтарэсы максімальнага росту прадукцыйнасці працы стаханаўцаў і ўсёй масы рабочых, эканоміі іх энергіі патрабуюць, каб рабочыя памяшканні былі забяспечаны паветрам найлепшай якасці. Стаханаўскія метады і тэмпы работы на многіх прадпрыемствах каранным чынам відазмяняюць умовы і абставіны працы. Вентыляцыя, адстаўшая ад агульных тэмпаў развіцця і тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, замест карысці зачастую перашкаджае вытворчасці.

Праведзенае Менскім інстытутам аховы працы ВЦСПС абследаванне ряду буйнейшых вентыляцыйных установак на прадпрыемствах БССР паказала, што толькі 30—40 проц. вентыляцыйных установак даюць здавальняючы эфект. Малая эфектыўнасць вентыляцыі абумоўлена недахопамі праектавання, а больш усяго нерацыянальнай эксплаатацыяй вентыляцыі.

Рад буйнейшых вентустановак праектаваўся на аснове выпадковых, павярхоўных даных, без дэталёвага ўчоту канкратных санітарна-гігіенічных і вытворча-тэхналагічных умоў і перспектыў развіцця вытворчасці (запалкавыя фабрыкі, швэйныя і інш.). Праектыроўшчыкі не прымаюць удзелу ў будаўніцтве і выпрабаванні эфектыўнасці вентустановак, адсюль фактычная іх безадказнасць за рэзультаты праектавання; рад буйных вентустановак у нас будаваўся па ўстарэўшаму прынципу, па шаблону, без уліку навейшых дасягненняў тэхнікі (скураныя заводы, швэйныя, трыкатажныя фабрыкі і т. д.). Буйным дэфектам у галіне праектавання вентыляцыі з'яўляецца слабае скарыстанне магчымасцей рацыянальнай натуральнай вентыляцыі і аэрацыі цэхаў. У гэтых адносінах можна было-б у нас дасягнуць вялікага эканамічнага і гігіенічнага эфекту. Пры праектаванні вентыляцыі недастаткова ўлічваюцца спецыфічныя метэаралагічныя ўмовы БССР, — адсюль рад памылак у разліках вентыляцыі.

Пры арганізацыі вытворчага клімату ў нашых прадпрыемствах неабходна ўлічыць навейшыя даныя навукі і тэхнікі ў гэтым напрамку. У сучасны момант шырока ставіцца пытанне аб укараненні ў нашу вытворчасць актыўнага клімата. Яшчэ да нядаўнага часу ў вентыляцыйнай практыцы пераважаў прынцып надзвычайнай баязні рэзкасці руху паветра і імкненне стварыць у памяшканнях роўнамерную пастаянную тэмпературу ва ўсёй кубатуры. У многіх вытворчасцях вентыляцыя будавалася па прынцыпу абароны чалавека ад паветра. Паветра падавалася па магчымасці далей ад месца знаходжання рабочых, будаваліся спецыяльныя казыркі, шчыты і інш. прыстасаванні, каб адхіліць патокі свежага паветра ад чалавека. Практыка паказала, што пабудаваная па прынцыпу «паветрабаязні» вентыляцыя сябе не апраўдала. Даныя абследавання Масквы і Ленінграда і іншых месц паказалі, што на прадпрыемствах, дзе вентыляцыя пабудавана па прынцыпу празмернай баязні сквазнякоў і стварэння пастаяннай аднолькавай тэмпературы, прастудныя захворванні вышэй, чым на тых прадпрыемствах, дзе пераважае клімат са значнымі метэаралагічнымі кантрастамі. Такое з'явішча тлумачыцца тым, што на тых вытворчасцях, дзе рабочыя часта падвяргаюцца ўздзейнічанню метэаралагічных кантрастаў, — частай змене тэмпературы, хуткасці паветра, прамяністай цяплыні, адбываецца трэніроўка цяплорэгулюючага апарата арганізма; апошні становіцца менш адчувальным і больш трывалым у адносінах рэзкіх уздзейнічанняў знешняй атмасферы. Напрыклад: рабочыя гарачых вытворчасцей — металургічная, кавальская і інш. — даюць паніжаную прастудную захворваемасць у параўнанні з вытворчасцямі тэкстыльнай, швэйнай і іншымі.

Прынцыпы актыўнага клімата пачынаюць укараняцца ў практыку нашай вытворчасці. На прадпрыемствах шырока ўкараняюцца розныя віды паветраных душаў. Праблемай актыўнага вытворчага клімата за апошнія гады таксама займаецца Менскі інстытут аховы працы ВЦСПС. На аснове праведзеных даследванняў па вопытнаму праекту інстытута пабудавана сістэма душыруючай вентыляцыі гофмамскіх прэсаў на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік». Гэта вентыляцыя значна аздаравіла ўмовы працы прэсаўшчыкоў і эфектыўна працуе на працягу некалькіх год. На запалкавай фабрыцы «Пролетарская перамога» па вопытнаму праекту інстытута вентыляцыя аўтаматнага цэха пераабсталявана па прынцыпу паветраных душаў, гэта значыць, асноўныя рабочыя месцы непасрэдна снабжаюцца свежым паветрам. Па гэтаму прынцыпу запраектавана вентыляцыя чатырох буйнейшых запалкавых фабрык СССР.

На прадпрыемствах, дзе ёсць вялікія лішкі цяплыні, для ахаладжэння памяшканняў да нормы патрэбны вялікія паветраабмены, магутныя вентустаноўкі і вялікія расходы для падагрэву прыточнага паветра. Інстытутам аховы працы ў сучасны момант распрацоўваецца сістэма падачы халоднага паветра непасрэдна ў рабочую зону.

Пры дапамозе спецыяльнай канструкцыі паветраразмеркавальніка прыточнае паветра непасрэдна ў рабочым месцы змешваецца ў адпаведнай прапорцыі з паветрам памяшкання і рабочаму падаецца сумесь паветра неабходнай тэмпературы.

Такую сістэму вентыляцыі можна будзе шырока пашыраць у вытворчасці, дзе ёсць лішкі цяплыні і паветра не забруджана газамі і пылам (швэйная вытворчасць, трыкатажная і інш.) Для аздараўлення ўмоў працы на фанерный вытворчасці інстытутам аховы працы ў сучасны момант у вопытным парадку распрацоўваецца тыповы праект вентыляцыі фанерных заводаў. Вопытная пабудова будзе зроблена на віцебскім фанерным заводзе. Па пытанню аэрацыі прамысловых будынкаў вядзецца работа па вывучэнню ўмоў прымянення гэтай сістэмы на запалкавых фабрыках. Папярэднія работы паказалі, што ў гэтых адносінах могуць быць дасягнуты станоўчыя рэзультаты. Безумоўна, інстытут у надзвычай абмежаванай ступені па свайму аб'ёму работ задавальняе патрабаванням прамысловасці БССР у галіне распрацоўкі пытанняў вентыляцыі. Для поўнага ахопу гэтага пытання неабходзен шырокі ўдзел праектуючых арганізацый і інжынерна-тэхнічнага персанала на вытворчасці, у асаблівасці неабходна шырока ўцягнуць у гэту справу стаханаўцаў вытворчасці.

РАСКІН.
Старшы навуковы работнік Менскага інстытута аховы працы.

ПА ПАЎТАРА ГЕКТАРА СЕНАЖАЦІ Ў ДЗЕНЬ

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Калгаснікі **Усеня Антон** і **Усеня Павел** з калгаса «Комуна», Пасецкага сельсовета, паказваюць стаханаўскія метады працы на касьбе. Гэтыя таварышы за дзень скасілі па паўтара гектара кожны замест нормы ў 0,40 га.

Караленя Фёдар Кірэеў, з гэтага-ж калгаса, скашвае 1,2 га ў дзень.

С. ЛЬВОВІЧ.

СКОШАНА 442 ГЕКТАРЫ

ЖЛОБІН, 25 чэрвеня. (БЕЛТА). У раёне разгарнулася масавая касьба і ўборка сена. Калгасы «Чырвоны партызан» і «Вольная праца» ўжо заканчваюць касьбу сенажаці. Калгаснікі арцелі «Вольная праца» з 550 гектараў сенажаці ўжо скасілі 442 гектары і застагавалі сена з 380 гектараў.

Лепшае сена калгас пачаў здаваць дзяржаве. Да ўсенароднага свята — 11 ліпеня — поўнасцю ўбраць сена і разлічыцца з дзяржавай па сеназдачы — такую задачу паставілі перад сабою калгаснікі.

ХУТКА СЯДЗЕМ ЗА РУЛЬ ТРАКТАРА

Крычаўская школа трактарных брыгадзіраў мае рэспубліканскае значэнне. Тут рыхтуюцца лепшыя механізатары сельскай гаспадаркі, якія 10 ліпеня раз'едуцца ў свае МТС для ўборачных работ. На скончанні школы кожны з нас добра будзе ведаць трактары «ХТЗ» і «ЧТЗ», ільноперабілку «ВНИИЛ-5», трактарныя жняркі і іншыя машыны.

У школе мы вывучаем не толькі сельскагаспадарчыя машыны, але заадно і вінтоўку і процігаз.

За 8 месяцаў сваёй вучобы мы падрыхтавалі 130 чалавек да значэння норм на значок «ГПА» і 50 варашылаўскіх стралкоў. Па іншыятыве партыйна - комсамольскай групы мы правялі пераход у процігазах на 30 кілометраў за 5 хадавых гадзін.

Запэўняем, што апраўдаем давер'е партыі і ўрада, па-стаханаўску будзем убіраць высокі сталінскі ўраджай без малейшых страт. Поўнасцю скарыстаем трактары і ўборачныя машыны.

Комсорг школы ЯКІМОВІЧ.

ФІЗКУЛЬТУРНАЕ СВЯТА Ў КІЕВЕ

КІЕЎ, 25 чэрвеня. Учора ў Кіеве — сталіцы Украіны — адбыўся грандыёзны парад фізкультурнікаў.

На трыбуне прысутнічалі кіраўнікі украінскага народу—тт. Касіор, Постышэў, Петроўскі, Любчэнка і інш. Разам з імі госці Украіны—маршал Совецкага Саюза тав. Будзённы і сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Косарэў.

Парад адкрыла калона Палаца піонераў, за імі ішлі юныя натуралісты, юныя рыбакі з вудачкамі на плячах, веласіпедысты, альпіністы і інш. За дзецьмі рушылася здаровая, шчаслівая, жыццерадасная моладзь.

Фізкультурнікі Петроўскага раёна на вялікім упрыгожаным аўтамабілі інспэціравалі росквіт народаў СССР. Фізкультурнікі Ленінскага раёна пабудавалі на грузавіку сапраўдную водную станцыю, плаўцы кідаліся з вышкі ў ваду, і на сонцы ззялі брызгі.

Раёны Кіева спаборнічалі ў лепшым афармленні сваіх калон. У параде прынялі ўдзел звыш 50 тыс. фізкультурнікаў.

КІРАЎНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНКІ Ў ГОМЕЛІ

ГОМЕЛЬ, 26 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). 23 чэрвеня ў Гомель прыбыў асноўны штат работнікаў кіраўніцтва ўноўарганізаванай Беларускай чыгункі — начальнікі служб і аддзелаў, інжынеры і інш.

Намеснік начальніка чыгункі тав. Дзік у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» паведаміў, што кіраўніцтва чыгункі пачало сваю работу з 25 чэрвеня і вядзе яе пакуль роўналежна з кіраўніцтвам Заходняй чыгункі. 30 чэрвеня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Беларускай чыгункі. У гэты дзень з 18 гадзін кіраўніцтва пачынае працаваць самастойна.

Кіраўніцтву чыгункі перадан будынак былога кіраўніцтва Заходняй чыгункі. У памяшканні праведзен рамонт і рэканструкцыя электраасвятлення. Закончана ўстаноўка прыбораў чыгуначнай сувязі. Усё падрыхтавана да пачатку работы.

Н. ГАСМАН.

КОННЫ ПРАБЕГ СІРОЦІНА—МЕНСК

СІРОЦІНА, 26 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). Мясовыя калгасныя, «варашылаўскія» кавалерыйскі ўзмоцнена рыхтуюцца да маючага адбыцца коннага прабегу па маршруту Сіроціна — Менск. Прабег арганізуецца да 11 ліпеня ў гонар гадавіны вызвалення БССР ад белапалякаў. Гэтымі днямі коннікі з трэніровачнымі мэтамі паспяхова зрабілі прабег па маршруту Сіроціна — Бешанковічы — Чашнікі — Сіроціна.

А. ЗАРУБЕЖНЫ.



У лагерах М-скай кавалерыйскай часці. Лейтэнант Селіванчык бяре на ня ні перашкоду. Фото Соркіна.

II УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД ВОЧНЫХ УРАЧОЎ

ЛЕНІНГРАД, 25 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння ў Выбаргскім доме культуры адкрыўся II усесаюзны з'езд вочных урачоў. Прыбыла 600 дэлегатаў з Масквы, Казані, Кіева, Баку, Тіфліса і іншых гарадоў СССР.

Доўга не змаўкаўшымі апладысментамі, стоячы, сустрэлі дэлегаты прапанову паслаць прывітанне вялікаму правадыру народаў таварышу СТАЛІНУ.

— Асноўнае пытанне нашага з'езда, — сказаў заслужаны дзеяч навукі праф. Авербах (Масква), — далейшае ўзмацненне барацьбы з трахомай. Зараз, калі калгаснае сялянства нашай краіны дабілася на культурным фронце буйных поспехаў, мы можам ужо гаварыць аб магчымасці поўнай ліквідацыі трахомы.

З'езд удзеліць таксама вялікую ўвагу барацьбе з туберкулёзам вачэй. Усяго будзе заслухана 79 дакладаў.

КАНЦЭРТЫ НА КРАЙНЯЙ ПОЎНАЧЫ

МАСКВА, 26 чэрвеня (БЕЛТА). 25 чэрвеня ў Арктыку па запрашэнню палітупраўлення «Главсевморпути» выехала брыгада салістаў оперы і балета Вялікага Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра СССР.

Да Красняярска артысты даедуць поездам, а далейшую частку свайго шляху будуць прадаўжаць на самалёце. Брыгада абляціць усю енісейскую поўнач, аж да астравоў Дзіксон. На працягу палярнага лета яна дасць канцэрты ў Енісейску, Ігарцы, Дудзінцы, Норыльску і т. д.

КАЛГАСНЫЯ ПІОНЕРЛАГЕРЫ

МАСКВА, 26 чэрвеня. (БЕЛТА). Партыя, урад і комсамол узяляюць велізарную ўвагу аздараўленчай рабоце сярод дзяцей. У гэтым годзе намечана ахапіць лагерамі і санаторыямі паўтара мільёна дзяцей.

Вялікае пашырэнне атрымліваюць калгасныя піонерлагеры; у Кабардына-Балкарыі створана 100 такіх лагераў на 12.000 дзяцей.

У Чэлябінскай вобласці калгасныя лагеры ахопяць 10.400 дзяцей, у Горкаўскім краі — 11.300 і т. д.

«ПУШКІНСКІ ДЗЕНЬ» У МАГІЛЕЎСКІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Гэтымі днямі па магілеўскаму аддзяленню чыгункі быў праведзен «пушкінскі дзень». На лінейныя станцыі з Магілева выехалі 10 выкладчыкаў літаратуры для чытання дакладаў аб жыцці і творчасці вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна.

У летні сад станцыі Магілеў прышло да тысячы чалавек. Сад быў упрыгожан. У зале летняга кіно з дакладам аб жыцці і творчасці А. С. Пушкіна выступіў дацэнт палітасветнага інстытута тав. Гутараў. Пасля даклада выступілі пачынаючыя пісьменнікі. Наралчык паравозных брыгад рабкор Вагін прачытаў свой верш «Да стагоддзя з дня смерці А. С. Пушкіна», за ім выступіў вучань сярэдняй школы Рагушкі. У заключэнні адбыліся выступленні клубных гурткоў мастацкай самадзейнасці і вучняў магілеўскай музычнай школы.

Г. ПАЎЛАЎ.

ВЫПУСК ЗУБНЫХ ТЭХНІКАЎ

У 1934 годзе пры менскім зубаўрачэбным тэхнікуме былі арганізаваны курсы па падрыхтоўцы зубных тэхнікаў. У пачатку ліпеня пасля двухгадовай вучобы адбудзецца першы выпуск курсаў. Будуць выпушчаны 37 зубных тэхнікаў.

Л. Е. ОЛІКЕР.

II8 НОВЫХ НАСТАЎНІКАЎ

ГОМЕЛЬ, 26 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). 28 чэрвеня гомельскі педагагічны інстытут выпускае 118 настаўнікаў для сярэдняй школы, педтэхнікумаў і рабфакаў. Інстытут раней быў двухгадовы, зараз-жа ён ВНУ з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Выпускнікі атрымліваюць спецыяльнасці выкладчыкаў матэматыкі, фізікі, хіміі і біялогіі.

ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ

Змоўклі звонкія дзіцячыя галасы ў школах. Змоўклі і апусцелі класы школ да самай восені.

Настаўнікі праводзяць зараз летнія канікулы. На вольным паветры, на сонцы, у асоавіяхімаўскіх лагерах яны праводзяць свой вольны час з тым, каб увосень з новымі сіламі і новай энергіяй узяцца за вучобу з дзетваро́й. Многія настаўнікі ў гэты час аддаюцца вучобе — павышаюць сваю кваліфікацыю, некаторыя едуць на экскурсіі па СССР.

Пераважная большасць настаўнікаў Менскага раёна скарыстоўваюць летнія канікулы для павышэння сваёй кваліфікацыі.

Напрыклад, 87 настаўнікаў—завочнікаў педагагічнага тэхнікума—знаходзяцца з 15 чэрвеня ў Менску на заліковай сесіі. Завочнікі Вышэйшага педагагічнага інстытута ў ліку 40 чалавек і 20 завочнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта прыязджаюць на заліковую сесію 1 ліпеня.

Паехалі 42 настаўнікі на паўтарамесячныя курсы. Пасля сканчэння курсаў яны будуць трымаць экзамен за педтэхнікум для таго, каб атрымаць права быць настаўнікамі пачатковых школ. 26 настаўнікаў едуць на курсы і потым будуць трымаць экзамен за вышэйшыя навучальныя ўстановы па розных спецыяльнасцях.

Апрача гэтага праведзен новы набор завочнікаў педтэхнікума ў ліку 46 чалавек.

Значная частка настаўнікаў раёнаў едзе на экскурсіі ў Маскву, Ленінград і іншыя гарады і мясцовасці Совецкага Саюза.

У асоавіяхімаўскіх лагерах 15 настаўнікаў. Тут яны нядрэнна праводзяць адпачынак і адначасова павышаюць свае вайсковыя веды. Шмат настаўнікаў едзе на курорты, у санаторыі і дамы адпачынку.

Так настаўніцтва Менскага раёна праводзіць свае летнія канікулы.

С. СЯМАШКА.

На калгасным пруду

На тэрыторыі калгаса імя Сталіна, Грабаўскага сельсавета, зроблен спуск вады з пруда, які займае плошчу ў 6 гектараў ёмістасцю 42 тыс. кубічных метраў вады. Пры спуску вады з пруда вылаўлена больш 300 пудоў рыбы. На дне пруда вялікія залежы ілу, якога налічваецца каля 60 тыс. кубічных метраў. Калгасы Грабаўскага і суседніх сельсоветаў вывезуць прудавы іл на палі для ўгнаення.

Пасля асушкі пруда будуць праведзены работы па паглыбленню яго і злучэнню з ракой Перуха. На прудзе будзе ўстаноўлена турбіна, якая прывядзе ў рух лынамамашыну калгаснай электрастанцыі і падобныя калгасныя прадпрыемствы, як млын і крупарушку.

П. ЕРМАКОЎ.

НОВЫЯ МІЖГАРОДНІЯ ТЭЛЕФОННЫЯ СТАНЦЫІ

Віцебск, Магілеў і акруговыя цэнтры БССР у бягучым годзе атрымаюць новыя міжгароднія тэлефонныя станцыі. На станцыях будуць устаноўлены новыя камутатары найбольш удасканаленай сістэмы. Занава абсталёўваюцца лінейна-апаратурныя залы, што дасць магчымасць весці па міжгародніх лініях адначасова некалькі гутарак. У Віцебску пабудова станцыі пачата. У бліжэйшы час пачнецца абсталяванне новай міжгароднай тэлефоннай станцыі ў Магілеве.

ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТЫЧНАЙ СТУДЫІ

У БССР прыязджае на гастролі ленінградская беларуская драматычная студыя пад кіраўніцтвам рэжысёра Ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра драмы тав. Жукоўскага. У склад студыі ўваходзіць 20 артыстаў. У рэпертуары— «Не было ні граша, а раптам алтын» Остроўскага і вечар беларускай народнай песні, скокаў і мастацкага слова. Студыя прабудзе ў БССР з 5 ліпеня да 30 жніўня і дасць свае гастролі ў Менску, Віцебску і 8 раёнах рэспублікі.

ТЫРАЖЫ МАСАВЫХ ПАЗЫК У ЛІПЕНІ

У ліпені праводзяцца два тыражы масавых пазык.

10—11 ліпеня ў Міхайлаве, Маскоўскай вобласці, адбудзецца 54-ты тыраж пазыкі «Трэцяга, рашаючага года пяцігодкі». Будзе разыграна 328 тыс. выйгрышаў на суму 9.999 тыс. руб.

У гэтыя-ж дні наладжваецца 15-ты тыраж пазыкі «Чацвертага, завяршаючага года пяцігодкі». Разыгрываецца 482 тыс. выйгрышаў на суму 46.009.600 руб. (ТАСС).

КОРАТКА

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і БЕЛТА)

* **Новая больніца на 60 ложкаў** будуецца ў мястэчку Езерышча — цэнтры Мехаўскага раёна.

* **Электрастанцыя** будуецца ў калгасе імя Мілешка, Ветрынскага раёна. Станцыя будзе асвятляць калгасныя дамы і забяспечваць электраэнергіяй мяльна-трацальны пункт.

* **Скурабутковыя прадпрыемствы БССР** на 21 чэрвеня выканалі шаснімесячную вытворчую праграму на 101,4 проц. На 101,5 проц. выканалі поўгадавы план прадпрыемствы Белшклотрэста.

* **Спартыўны стадыён** абсталёван у Бешанковічах. У радзе калгасаў раёна абсталяваны спартыўныя гарадкі.

* **Парк культуры і адпачынку** ўрачыста адкрыт у калгасе «Окцябр», Полацкага раёна.

ПАВЕДАМЛЕННІ

27 чэрвеня, у 5 гадзін вечара, у малой зале Дома партактыва адбудзецца інструкцыйная нарада дакладчыкаў, у тым ліку рэзерва, вылучаных Сталінскім горкамам КП(б)В па пытанню абмеркавання праекта Канстытуцыі СССР (спіс дакладчыкаў і рэзерва змешчан у «Звязде» 23 чэрвеня).

**

30 чэрвеня ва універсітэце для стахановцаў (зялёны тэатр сада «Профінтэрн») у 7 гадзін вечара для партактыва, слухачоў стахановскага універсітэта, прапагандыстаў і агітатараў партыйна-комсамольскай сеткі адбудзецца лекцыя тав. Левіна В. Л. (Масква) «Аб асновах знешняй совецкай палітыкі». Білеты — у горкамах.

У выпадку дрэннага надвор'я лекцыя адбудзецца ў закрытым тэатры сада «Профінтэрн».

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

22 чэрвеня ў Маскве адкрылася чарговая сесія бюро Камітэта гігіены Ліга нацый. Сесію адкрыў народны камісар аховы здароўя РСФСР тав. Камінскі. НА ЗДЫМКУ: Тав. Камінскі вітае ўдзельнікаў сесіі. Фото Кудаярава (Саюзфото).

Памяшканне Белдзяржтэатра

Гастролі харкаўскага дзяржаўнага украінскага тэатра імя Т. Г. ШЭЎЧЭНКА (б. Берэзіль)

М. Горкі

27 чэрвеня

ВАССА ЖЕЛЕЗНОВА

Пачатак у 8 г. веч.

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» | ГУЛЬНЯ Ў ЛЮБОЎ

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР | Лунны камень. Экстраны выпуск Союзкінохронікі „МАКСІМ ГОРКІ".

«ПРОЛЕТАРЫЯ» | ЕГІТ

«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» | ПЕТЭР

„СПАРТАК" | ПАЭТ І ЦАР

Дом партактыва Менгаркома КП(б)Б

27 чэрвеня, у 8 з палов. гадзін вечара

АДБУДЗЕЦЦА

вялікі справаздачны КАНЦЭРТ

студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і музычнага тэхнікума.

УВАХОД ПА ЗАПРАШАЛЬНЫХ БІЛЕТАХ.

Мар'іна-Горскі сельскагаспадарчы тэхнікум, які рыхтуе агранамаў-паляводаў сярэдняй кваліфікацыі, абвяшчае АСЕННІ ПРЫЁМ студэнтаў на 1936—37 навучальны год.

У тэхнікум прымаюцца асобы абодвух полаў ва ўзросце ад 16 да 30 год, якія маюць падрыхтоўку не ніжэй няпоўнай сярэдняй школы (сямігодкі).

Прыём заяў аб залічэнні ў тэхнікум — з 1 ліпеня да 10 жніўня.

Да заявы паступаючага павінны быць даданы наступныя дакументы:
а) кароткая аўтабіяграфія;
б) пасведчанне аб сканчэнні сямігодкі (абавязкова ў арыгінале);
в) даведка аб здароўі;
г) дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам на кожнай з іх.

Прыёмныя іспыты — з 15 да 25 жніўня.

Усе паступаючыя падвяргаюцца прыёмным іспытам у аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы: па матэматыцы, фізіцы, белмове і літаратуры, фізічнай геаграфіі і палітграмаце па праграмах, устаноўленых НКЗ СССР.

Іспыты па ўсіх прадметах праводзяцца вусныя, а па белмове і матэматыцы — як вусныя, так і пісьмовыя.

Прыязджаючыя на іспыты абавязкова павінны мець пры сабе пашпарт.

Мар'іна-Горскі сельгастэхнікум знаходзіцца пры станцыі Пухавічы. З Менскам вносіны прыгарадным поездам.

Заявы падаваць па адрасу: ВОР, паштовае аддзяленне Мар'іна-Горка. Мар'іна-Горскаму сельскагаспадарчаму тэхнікуму.

Дырэктар тэхнікума П. ЛЕВІЦКІ.

МЕНСКІ ГІДРАМЕЛІЯРАЦЫЙНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае ПРЫЁМ НА ПЕРШЫ КУРС на 1936—37 навучальны год.

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-гідрамеліяратараў.

У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 16 да 30 год. Усе паступаючыя ў тэхнікум павінны мець закончаную асвету не ніжэй сямігодкі.

Незалежна ад асветы ўсе паступаючыя ў тэхнікум праходзяць іспыты ў аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы (сямігодкі) па матэматыцы, фізіцы, фізічнай геаграфіі, палітграмаце, беларускай мове і літаратуры.

Паступаючыя ў тэхнікум разам з заявай, прыкладаюць наступныя дакументы: атэстат аб сканчэнні навучальнай установы (арыгінал), пашпарт (прад'яўляецца асабіста), даведку аб стане здароўя, аўтабіяграфію, у якой паступаючы павінен даць ад сабе наступныя весткі: год і месяц нараджэння, нацыянальнасць, партыйнасць, соцстановішча бацькоў, заработак бацькоў, адносіны да вайсковай павіннасці, 2 фотакарткі, засведчаныя сельсоветам, і на 40 кап. марак.

Прыём заяў з дакументамі праводзіцца да 15 жніўня.

Тэрмін прыёмных іспытаў — з 15 да 25 жніўня.

Пачатак заняткаў — з 1 верасня.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй згодна існуючага законапалажэння. Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам.

Усе залічаныя ў тэхнікум пры яўцы на заняткі павінны прывезці з сабой для асабістага карыстання коўдру, падушку і дзве змены пасцельнай бялізны (наўлечкі і простыні).

Заявы падаваць на імя дырэктара тэхнікума па адрасу: гор. Менск, плац Волі, № 4, гідратэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Даводзіцца да ведама ўсіх устаноў і арганізацый.

што ў адпаведнасці з пастановай СПА ад 27 красавіка 1936 г. і загадаў НКЦП ад 7 мая 1936 г. і ГУТАП'а ад 8 мая 1936 г. аб зліянні «ВАТАЗБЫТА» і «ВАТАЗАПЧАСЦЬЗБЫТА» у адзіную арганізацыю па збыту прадукцыі аўтатрактарнай прамысловасці «Аўтатрактаразбыт», БЕЛ. АДДЗЯЛЕННЕ «ВАТАЗБЫТ» і «ВАТАЗАПЧАСЦЬЗБЫТ» з 1 ліпеня 1936 г. ЗЛІВАЮЦЦА Ў АДНУ СІСТЭМУ

Бел. аддзялення дзяржаўнай Усесаюзнай канторы „АЎТАТРАКТАРАЗБЫТ"

На тэрыторыі БССР з гэтага часла функцыянуюць:

1. Бел. аддзяленне «Аўтатрактаразбыт», — гор. Менск, Суражская вул. № 10, тэл. № 20-862, 23-941.
2. Менская база — гор. Менск, Гандлёвая вул, 29. тэл. 20-925.
3. Аршанская база — г. Орша, Комунальны зав. № 46, тэл. 1-55.
4. Гомельская база — г. Гомель, Совецкая пл. № 1, тэл. 9-59.
5. Віцебскае агенцтва — г. Віцебск, Шасейная № 14, тэл. 6-09.

МЕНСКАЯ БАЗА абслугоўвае раёны: Менскі, Смалявіцкі, Барысаўскі, Бягомльскі, Плешчаніцкі, Лагойскі, Заслаўскі, Дзяржынскі, Уздзенскі, Капыльскі, Грэскі, Слуцкі, Чырвонаслабодскі, Старобінскі, Любаньскі, Старадарожскі, Глускі, Парыцкі, Бабруйскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Бярэзінскі, Асіпавіцкі, Пухавіцкі, Чэрвеньскі і Смілавіцкі.

ГОМЕЛЬСКАЯ БАЗА абслугоўвае раёны: Гомельскі, Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Даманавіцкі, Добрушскі, Ельскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Капаткевіцкі, Камарынскі, Кармянскі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Прапойскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі, Тураўскі, Церахаўскі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Чачэрскі, Свяцілавіцкі і Журавіцкі.

АРШАНСКАЯ БАЗА абслугоўвае раёны: Аршанскі, Магілеўскі, Талачынскі, Крупскі, Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Крычаўскі, Чырвонапольскі, Бялыніцкі, Багушэўскі, Горацкі, Дрыбінскі, Дубровенскі, Круглянскі, Лепельскі, Мсціслаўскі, Сенненскі, Халопеніцкі, Чашніцкі, Чавускі, Шклоўскі, Рагачоўскі, Хоцімскі, Чэрыкаўскі і Быхаўскі.

ВІЦЕБСКАЕ АГЕНЦТВА абслугоўвае раёны: Віцебскі, Бешанковіцкі, Ветрынскі, Гарадоцкі, Асвейскі, Дрысенскі, Лёзнянскі, Мехаўскі, Полацкі, Расонскі, Суражскі, Сіроцінскі і Ушацкі.

За атрыманнем запасных частак належыць зварачацца на ўказаныя пункты.

БЕЛ. АДДЗЯЛ. «АЎТАТРАКТАРАЗБЫТ».

Магілеўскі беларускі педагагічны тэхнікум абвяшчае АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ.

Будзе прынята 300 чал.

Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 25 год, якія скончылі НСШ.

Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй па паспяховасці.

Тэхнікум рыхтуе настаўнікаў пачатковых школ. Лепшая частка выпускнікоў рэкамендуецца для НСШ.

Паступаючыя трымаюць іспыты па гісторыі, матэматыцы, мове — беларускай і рускай і геаграфіі.

Для паступлення неабходна падаць дакументы:
атэстат аб сканчэнні НСШ (арыгінал);
заваяную анкету;
метрыку;
даведку аб здароўі;
дзве фотакарткі і марак на 40 кап.

Аб часе іспытаў паступаючыя будуць паведамлены дадаткова.

Адрас: г. Магілеў, БССР, Быхаўская, 18, магілеўскі Белпедтэхнікум, прыймовай камісіі.

АДМІНІСТРАЦЫЯ

Высочанскі дашкольны педагагічны тэхнікум абвяшчае АСЕННІ НАБОР студэнтаў на першы курс у колькасці 120 чалавек.

Тэхнікум рыхтуе кадры для дашкольных устаноў, інспектароў-метадыстаў раённага маштабу. У тэхнікум прымаюцца асобы з асветай за НСШ ва ўзросце ад 15 да 35 гадоў.

Да заявы неабходна прыкласці наступныя дакументы: даведку аб узросце, аб адукацыі (арыгінал), аб стане здароўя, дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх.

Заявы прымаюцца да 20 жніўня. Іспыты — з 22 да 29 жніўня — праводзяцца ў аб'ёме праграмы няпоўнай сярэдняй школы, або 7 класаў сярэдняй школы па наступных прадметах: белмове, рускай мове (вусна і пісьмова), матэматыцы (пісьмова і вусна), грамадазнаўству, геаграфіі (вусна). Асобы, якія жадаюць паступіць на другі або трэці курс тэхнікума, трымаюць іспыты па праграме першага або другога курса тэхнікума.

Заняткі пачнуцца 1 верасня.

Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і стыпендыяй у залежнасці ад паспяховасці.

Заявы накіроўваць па адрасу: ст. Крынкі, МБВ чыгункі. Высочанскі тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Рэдакцыя газеты „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ МАШЫНІСТКІ на дзённую і вечарнюю работу. Зварачацца па адрасу: Совецкая, 63, 3-ці паверх, у сакратарыят

Прафком і калектыў работнікаў Белканторы Саюзкансервбыта выказваюць спачуванне работніку менскай базы Саюзкансервбыта тав. ЛЕВІНУ В. Х. з прычыны заўчаснай смерці ЯГО ЖОНКІ.

СЕННЯ, у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай вуліц)

ГОРКАМСОД СКЛІКАЕ НАРАДУ

старшынь і сакратароў камсодаў гор. Менска.

Яўка старшынь і сакратароў камсодаў абавязкова.

Уваход па білетах, якія можна атрымаць у горкамсодзе і ў ашчадкасе № 16.

ФЗМК у сувязі з важнасцю пытання забяспечыць яўку.

Старшыня горкамсода ЗАЛЕСКІ

28 чэрвеня, у 2 гадзіны дня, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай вуліц)

горфінаддзел і горашчадкаса СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ

галоўных (старшых) бухгалтараў і бухгалтараў, узначальваючых разліковыя часткі ўсіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый гор. Менска.

Своечасовая яўка усіх выклікаемых на нараду абавязкова.

Кіраўнікам устаноў, старшыням ФЗМК у сувязі з важнасцю пытання забяспечыць яўку выклікаемых на нараду.

Уваход па білетах, атрыманых у ашчадкасе № 16.

МЕНГАРФА, ГОРАШЧАДКАСА.

Усебеларускі палітыка-асветны інстытут абвяшчае ПРЫЁМ на 1936—37 навучальны год на факультэты: МАСАВЫ і БІБЛІЯТЭЧНЫ.

МАСАВЫ факультэт рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры для палітасветных інстытутаў горада і раённых цэнтраў: акруговых і раённых палітасвет. інспектароў, загадчыкаў буйных гарадскіх клубаў, метадыстаў і настаўнікаў па палітасветных дысцыплінах.

БІБЛІЯТЭЧНЫ факультэт рыхтуе загадчыкаў буйных гарадскіх і раённых бібліятэкам, метадыстаў бібліятэчнай справы і выкладчыкаў бібліятэчных дысцыплін.

Тэрмін навучання на абодвух факультэтах 3-гадовы.

У інстытут прымаюцца асобы, якія маюць закончаную сярэднюю асвету, ва ўзросце ад 17 да 25 год.

Падаючыя заяву аб прыёме павінны прыкласці да заявы дакументы: даведку аб адукацыі, пашпарт (прад'яўляецца асабіста), аўтабіяграфію, даведку аб здароўі і дзве фотакарткі з засведчаным уласнаручным подпісам.

Паступаючыя праходзяць іспыты, згодна правіл прыёму ў педагагічныя ВНУ, па беларускай мове, рускай мове, геаграфіі, матэматыцы і грамадазнаўству.

Прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам.

Прыём заяў — з 15 чэрвеня да 1 жніўня.

Іспыты з 1 да 20 жніўня.

Адрас інстытута: Магілеў, БССР, Комсамольская вул., № 20.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Друкарні „ЗВЯЗДЫ" ПАТРЭБНЫ: вучні і дапасобныя рабочыя ў ліцітыпны цэх, а таксама работнікі аховы. Зварачацца: Совецкая, 63, другі паверх.

МЕНСКАМУ ТРЭСТУ РЭСТАРАНАЎ І КАФЭ ПАТРЭБНЫ: бухгалтары-рэвізоры, бухгалтары-інструктары, старшыя бухгалтары на самастойныя баланасы, бухгалтары і картатэчыкі.

Зварачацца да галоўнага бухгалтара трэста па адрасу: Менск, Рэволюцыйная, 2, тэл. № 20-842.

Тыраж 90.550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—143.